НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ”

УДК 94(476.5)(043.3)“8/17”

Дук
Дзяніс Уладзіміравіч

# ПОЛАЦК IX – XVIII СТСТ.: УЗНІКНЕННЕ, ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ (ПА АРХЕАЛАГІЧНЫХ І ПІСЬМОВЫХ КРЫНІЦАХ)

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

Мінск, 2011

Работа выканана на кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт".

| | |
|---|---|
| Навуковы кансультант | **Штыхаў Георгій Васільевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" |
| Афіцыйныя апаненты: | **Пілецкі Віктар Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права прыватнай установы адукацыі "Мінскі інстытут кіравання"; |
| | **Марзалюк Ігар Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры археалогіі і дапаможных гістарычных дысцыплін установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова"; |
| | **Люты Анатоль Міхайлавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка" |
| Апаніруючая арганізацыя | Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы" |

Абарона адбудзецца 30 лістапада 2011 года ў 14 гадзін на пасяджэнні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; e-mail – marat@history.by; тэлефон вучонага сакратара: 8-017-284-18-69.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы 25 кастрычніка 2011 года.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных
навук, дацэнт М.Г. Жылінскі

# УВОДЗІНЫ

Фарміраванне беларускай нацыі, працэсы яе генезісу, развіцця і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці з'яўляюцца прыярытэтнымі накірункамі комплекснай дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь.

Полацк – сталіца першай дзяржавы на беларускіх землях. Гістарычнае развіццё Полацка абумовіла фарміраванне сучаснай мадэлі нацыянальнай дзяржаўнасці, прадвызначыла своеасаблівасць працэсаў генезісу беларускай нацыі. Полацк займаў выключна важнае месца ў дзяржаўнай сістэме Старажытнай Русі, Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай з IX па XVIII ст. Зварот да гісторыі Полацка з'яўляецца неабходным падмуркам у рэалізацыі прыярытэтных накірункаў сучаснай дзяржаўнай палітыкі, культуры і ідэалогіі Рэспублікі Беларусь. Комплекснае вывучэнне гісторыі Полацка напярэдадні 1150-гадовага юбілею горада ў 2012 г. з'яўляецца вельмі актуальным, запатрабаваным і неабходным. Адкрыццё новых археалагічных помнікаў, выяўленне новых заканамернасцяў гістарычнага развіцця Полацка пакладзена ў аснову дадзенага дысертацыйнага даследавання.

Гістарычная навука мае магчымасць пастаянна ўзбагачаць веды пра мінулае Полацка дзякуючы археалагічным крыніцам. Для значнай часткі гісторыі Полацка з IX па XIV ст. археалагічныя даныя з'яўляюцца прыярытэтнымі, а нярэдка – адзінымі. Па перыядзе XV – XVIII стст. прыярытэт археалагічных крыніц у галіне вывучэння рамёстваў, гарадской інфраструктуры, лакалізацыі аб'ектаў нерухомасці і іх храналогіі з'яўляецца безумоўным.

Дысертацыйнае даследаванне пабудавана ў першую чаргу на вывучэнні археалагічных даных, атрыманых у выніку шматгадовых комплексных і мэтанакіраваных археалагічных раскопак. Аднак рэканструкцыя гісторыі Полацка можа быць максімальна аб'ектыўнай пры выкарыстанні ўсяго корпуса крыніц – археалагічных, пісьмовых, выяўленчых і інш., што рэалізавана ў раскрыцці прадмета дадзенага даследавання.

Сляды дзейнасці многіх пакаленняў палачан, сотняў тысяч жыхароў старажытнага горада захаваліся ў культурным пласце Полацка ў выглядзе матэрыяльных рэшткаў. Рухомыя і нерухомыя артэфакты, а таксама ўласна культурны пласт з'яўляюцца важнейшымі гістарычнымі крыніцамі, аб'ектам вывучэння не аднаго пакалення археолагаў. Дзякуючы археалагічнай навуцы многія аспекты гісторыі Полацка IX – XVIII стст. сталі вядомы шырокай грамадскасці, а шэраг стэрэатыпных уяўленняў перагледжаны. Археалагічнае вывучэнне Полацка дазваляе раскрыць механізм пераўтварэння горада з летапіснага “града” ў развіты сацыяльна-эканамічны цэнтр Старажытнай Русі, Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Праблема вывучэння гісторыі Полацка не новая ў айчыннай археалогіі. Прадметам даследаванняў беларускіх археолагаў, у першую чаргу А.М. Ляўданскага, Л.В. Аляксеева, Г.В. Штыхава, С.В. Тарасава, з’яўляліся асобныя пытанні палітычнага і сацыятапаграфічнага развіцця, забудовы і планавання Полацка, а таксама рамесных заняткаў і гандлёвых сувязяў яго насельніцтва. Аднак комплексна пытанні ўзнікнення, фарміравання і развіцця Полацка IX – XVIII стст. у кантэксце ўрбаністычнай структуры сярэдневяковых і новачасных гарадоў не даследаваліся. Пры гэтым навуковае вывучэнне гісторыі ўсходнеславянскіх гарадоў на сучасным этапе мае шырокія магчымасці дзякуючы пастаянна папаўняемай крынічнай базе і метадам археалагічнага даследавання.

З шэрага пытанняў па тэме дысертацыі найбольш даследаваным можна лічыць тапаграфічнае развіццё Полацка і полацкае рамяство. Аднак пашырэнне крынічнай базы (увядзенне ў навуковы зварот пісьмовых крыніц і новых артэфактаў, здабытых падчас археалагічных раскопак) дазволіла ўвесці ў айчынную гістарыяграфію новыя палажэнні, а таксама істотным чынам пераглядзець многія ўжо існуючыя.

У адрозненне ад даследаванняў А.М. Ляўданскага, Л.В. Аляксеева, Г.В. Штыхава, С.В. Тарасава ў прадстаўленай дысертацыі *упершыню* поўна і з прыцягненнем вялікага корпуса гістарычных крыніц разгледжаны наступныя пытанні:

– дынаміка сацыяльнай тапаграфіі і развіцця тэрытарыяльнай структуры Полацка ў шырокім храналагічным кантэксце і па стагоддзях на працягу IX – XVIII стст.;

– параўнальная характарыстыка сацыяльнай і тэрытарыяльнай структуры Полацка з іншымі дзяржаватворчымі цэнтрамі Усходняй Еўропы IX – XIII стст.;

– эвалюцыя форм і тэхналогіі вытворчасці бытавой керамікі (ляпной і ганчарнай), яе распаўсюджванне ў культурным пласце Полацка;

– вызначэнне асаблівасцяў размяшчэння і назваў полацкіх вуліц, лакалізацыя ратушы, шэрага буйнейшых культавых аб’ектаў (бернардзінскага кляштара 1498 – 1563 гг., Барысаглебскай і Пятніцкай цэркваў і інш.);

– разгорнутая характарыстыка асноўных рысаў пасадскай забудовы і матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка ў IX – XVIII стст.;

– паходжанне і антрапалагічны склад насельніцтва Полацка ў XVI – XVIII стст.;

– дынаміка развіцця полацкіх рамёстваў паводле археалагічных комплексаў асноўных горадаўтваральных пасадаў Полацка – Вялікага і Запалоцкага;

– лакалізацыя, археолага-антрапалагічнае вывучэнне і картаграфія полацкіх могільнікаў IX – XVIII стст.;

– вызначэнне статусу Барысаглебскага манастыра на падставе археалагічнага вывучэння.

У дысертацыі таксама прадстаўлена гістарыяграфія і гісторыя вывучэння Полацка з улікам найноўшых даных; прыведзены новыя звесткі аб стратыграфіі культурных напластаванняў старажытнейшых частак Полацка – гарадзішча і паселішчаў; прадстаўлена дынаміка развіцця і трансфармацый полацкага дзяцінца ў рэтраспектыве часу і эвалюцыя парканаў гарадскіх пасадаў; удакладнена колькасць і размяшчэнне культавых аб’ектаў, гарадскіх фальваркаў у XV – XVIII стст.; вызначана дынаміка колькасці насельніцтва на працягу IX – XVIII стст.; прыведзены новыя археалагічныя даныя аб гандлёвых сувязях палачан, іх этнасацыяльным статусе і прынцыпах самакіравання.

Дысертацыйнае даследаванне з’яўляецца неабходнай асновай для далейшага вывучэння пытанняў функцыянавання інстытутаў свецкай і духоўнай улады, вызначэння накірункаў далейшага археалагічнага вывучэння і аховы гістарычнага ландшафту, правядзення гістарычных рэканструкцый, выяўлення новых гістарычных помнікаў Полацка і дэталізацыі пытанняў развіцця вытворчай і гандлёвай дзейнасці палачан.

Магчымасці археалогіі ў спасціжэнні гістарычнай спадчыны самага старажытнага горада Беларусі практычна бязмежныя, але малаэфектыўныя без уліку вопыту археалагічнага вывучэння такіх найстаражытнейшых усходнеславянскіх цэнтраў, як Ладага, Ноўгарад, Кіеў, Ізборск, Віцебск, Тураў і інш. У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны грунтоўныя метадалагічныя і гістарыяграфічныя работы айчынных археолагаў (Э.М. Загарульскага, П.Ф. Лысенкі, А.М. Ляўданскага, В.М. Ляўко, І.А. Марзалюка, Г.В. Штыхава і інш.), а таксама археолагаў і гісторыкаў блізкага і далёкага замежжа (В.В. Сядова, П.П. Талочкі, В.Л. Яніна, С. Рогдэвальда (S. Rohdewald) і інш.).

Такім чынам, вывучэнне гісторыі ўзнікнення, фарміравання і развіцця Полацка ў IX – XVIII стст. з’яўляецца актуальнай задачай, і вялікую ролю ў вырашэнні гэтай праблемы адыгрываюць магчымасці археалагічнай навукі.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з дзяржбюджэтнай тэмай ГБ-0726 УА "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт" (далей – ПДУ) "Гісторыя краязнаўства на Віцебшчыне ў XIX – XX стст." (2005 – 2010 гг.).

Тэма даследавання адпавядае прыярытэтным накірункам фундаментальных навуковых даследаванняў па заданні Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў (БРФФД) і Расійскага гуманітарнага навуковага фонду Г08 Р014 "Станаўленне і развіццё сістэмы беларуска-расійскіх міжрэгіянальных кантактаў: сацыякультурны і эканамічны аспекты (Полацк, Віцебск, Ноўгарад, Пскоў; IX – XX стст." (2008 – 2010 гг.); заданні фундаментальных навуковых даследаванняў па праблемах гісторыі і культуры, экалогіі і прыродакарыстання Прыдзвінскага краю БРФФД, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Полацкага гарадскога выканаўчага камітэта ГБ-0629 "Полацк 2009", тэма "Пасадская структура Полацка IX – XVIII стст. (археолага-антрапалагічная характарыстыка)" (2009 – 2011 гг.).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэтай даследавання* з'яўляецца вывучэнне гісторыі ўзнікнення, дынамікі фарміравання і развіцця Полацка, яго сацыяльнай структуры і тапаграфіі, гарадскіх рамёстваў і гандлю ў шырокім храналагічным кантэксце (IX – XVIII стст.).

*Задачы*:

– вылучыць і ахарактарызаваць этапы археалагічнага вывучэння Полацка;

– даць характарыстыку культурнага пласта і бытавой керамікі Полацка як асноўнай катэгорыі археалагічных знаходак;

– вызначыць генезіс, агульныя і адметныя рысы сацыяльна-гістарычнай тапаграфіі Полацка ў кантэксце развіцця асноўных дзяржаватворчых цэнтраў Старажытнай Русі IX – XIII стст.;

– вызначыць статус і ролю замкаў у развіцці сацыяльнай тапаграфіі Полацка, вылучыць дынаміку развіцця полацкіх пасадаў, колькасці, этнічнага складу, сацыяльнай арганізацыі, гандлёва-рамесных заняткаў гарадскога насельніцтва ў IX – XVIII стст.;

– даць характарыстыку асноўных элементаў гарадской інфраструктуры і жыццёвай прасторы насельніцтва Полацка ў рэтраспектыве часу.

**Аб'ект даследавання** – археалагічныя помнікі Полацка IX – XVIII стст.: гарадзішча, паселішчы і вакольны горад, Верхні і Ніжні замкі, пасады, могільнікі, культавыя аб'екты. Выбар аб'екта даследавання абумоўлены выключна важным значэннем матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Полацка ў станаўленні і развіцці нацыянальнай культуры і дзяржаўнасці. Полацк як

сталіца першага дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх землях на працягу разглядаемага перыяду меў адметны статус у дзяржаўнай сістэме Старажытнай Русі і Вялікага княства Літоўскага.

**Прадмет даследавання** – узнікненне, дынаміка фарміравання і развіцця Полацка, сацыяльнага, этнічнага і дэмаграфічнага складу гарадскога насельніцтва, сацыяльна-гістарычнай тапаграфіі і асобных аспектаў матэрыяльнай культуры, рамёстваў і гандлю ў IX – XVIII стст.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Існаванне Полацка паводле летапісаў у 862 г. цалкам пацвярджаецца археалагічным матэрыялам. На раннім этапе (канец VIII – X стст.) Полацк з'яўляўся племянным цэнтрам насельніцтва культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў – летапісных крывічоў. Выяўлены і даследаваны культурны пласт і артэфакты апошняй чвэрці I тыс. н. ч. на полацкім гарадзішчы і паселішчах каля яго. У адрозненне ад ранніх пасяленчых структур Ладагі і Ноўгарада (Рурыкава гарадзішча), насельніцтва са Скандынавіі не аказала істотнага ўздзеяння на працэс фарміравання сацыяльнай і тапаграфічнай структуры пачатковага Полацка (канец VIII – X стст.). Полацк з'яўляўся горадам у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміна з сярэдзіны XI ст. – значна раней за іншыя гарады Беларусі. На аснове паселішча каля падножжа гарадзішча ў першай палове XI ст. утварыўся вакольны горад – прадцеча Вялікага пасада. У сярэдзіне XI ст. у Полацку скл аліся неабходныя атрыбуты сярэдневяковага горада – наяўнасць разгалінаваных рамёстваў і гандлю, пражыванне на пасадах вялікай колькасці гарадскога насельніцтва, складаная гарадская інфраструктура з лініяй абарончых умацаванняў, наяўнасць мураваных культавых пабудоў.

2. Дынаміка тэрытарыяльнага развіцця Полацка ў сярэдзіне XI – XV стст. адпавядала схеме "дзяцінец – вакольны горад – пасад". Дзяцінец Полацка размяшчаўся на гарадзішчы з IX да пачатку XIV ст. У гэты час гарадзішча выкарыстоўвалася як жылая і добра ўмацаваная рэзідэнцыя полацкіх князёў. Вакольны горад існаваў на працягу канца X – першай паловы XI ст. (тэрыторыя будучага Ніжняга замка, часткі будучых Верхняга замка і Вялікага пасада). Чорная гара (тэрыторыя будучага Верхняга замка) з моманту ўзвядзення Сафійскага сабора (сярэдзіна XI ст.) і комплексу мураваных цэркваў (XII ст.) да пачатку XIV ст. мела сакральны і адміністрацыйна-цырыманіяльны статус. На большай частцы Чорнай (Замкавай) гары пражывала пасадскае насельніцтва. Ролю дзяцінца Верхні замак пачаў выконваць пасля спынення існавання княжацкай рэзідэнцыі на старажытным гарадзішчы, перапланіроўкі замкавай тэрыторыі і пабудовы на ёй крапасных умацаванняў у першай палове XIV ст.

3. Генезіс полацкіх пасадаў адбыўся ў першай палове XI ст. і быў звязаны з існаваннем вакольнага горада. Першае значнае тэрытарыяльнае пашырэнне полацкіх пасадаў адбываецца ў другой палове XI ст. У гэты час за кошт

утварэння Вялікага і Запалоцкага пасадаў плошча Полацка дасягае 180 га. Абодва пасады былі ўмацаваны парканамі, якія выконвалі фартыфікацыйныя функцыі да пачатку XVIII ст. На левым беразе Дзвіны з XI ст. існавалі мясцовасці Слабада і Востраў. У XIII ст. плошча пасадаў, а адпаведна і тэрыторыя горада, значна скарачаюцца. Уваходжанне Полацка ў склад ВКЛ (пасля 1307 г.) абумовіла змены ў яго адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры (спыненне існавання княжацкай рэзідэнцыі на гарадзішчы, набыццё Верхнім замкам функцый дзяцінца і адміністрацыйнага цэнтра Полацка). Пасля надання Полацку магдэбургскага права ў 1498 г. адбываецца чарговая змена статусу асобных частак пасяленчай структуры горада. Верхні замак паступова губляе статус адміністрацыйнага цэнтра горада. З 1530-х г. адміністрацыйнае кіраванне Полацкам ажыццяўляецца праз магістрат, размешчаны на Вялікім пасадзе ў будынку ратушы.

4. Напрыканцы XV ст. і ў першай палове XVI ст. скарацілася плошча асноўных гарадскіх пасадаў – Вялікага і Запалоцкага. Гэта адбылося ў выніку ваенных паходаў на Полацк маскоўскіх войск і канфрантацыі паміж часткай залежнага ад свецкіх і духоўных феадалаў насельніцтва, з аднаго боку, і магістратам – з другога. Частка залежнага ад баяр і духавенства пасадскага насельніцтва была вымушана перасяліцца на левы бераг р. Дзвіны, дзе ўтварыліся пасады з разгалінаванай гарадской інфраструктурай – Востраўскі, Крыўцоў, Слабадскі і Экіманскі. Сумарная плошча левабярэжных пасадаў у XVI ст. дасягала 40 га. Крыўцоў і Экіманскія пасады з’яўляліся новымі тэрытарыяльнымі адзінкамі ў структуры Полацка.

5. Значнае пашырэнне тэрыторыі горада адбываецца пасля Інфлянцкай вайны. У XVII ст. на левым беразе Дзвіны існавалі Экіманскі і Крыўцоў пасады з мясцовасцямі Востраў, Старая і Новая Слабоды. На працягу XVII – XVIII стст. плошча Полацка дасягнула максімальных памераў (каля 250 га). З часоў вызвалення Полацка ў 1579 г. аднаўляецца пасадская забудова ў межах былых парканаў і з’яўляюцца новыя пасяленчыя структуры па-за іх межамі. Полацк меў развітую гарадскую інфраструктуру з разгалінаванай вулічнай сеткай, пераважна драўлянай грамадзянскай забудовай і абарончымі ўмацаваннямі замкаў і пасадаў. Прычынай тэрытарыяльнага пашырэння Полацка з’яўлялася ўзрастанне колькасці пасадскага насельніцтва, якое мела выключна спрыяльныя ўмовы для развіцця рамёстваў і гандлю. У XVIII ст. у Полацку ствараецца ансамбль мураваных каталіцкіх кляштараў (базыліянскі, бернардзінскі, дамініканскі, францысканскі), узводзяцца мураваныя карпусы езуіцкага калегіума з касцёламі Св. Стэфана і праваслаўны Багаяўленскі манастыр.

6. Сацыяльная арганізацыя насельніцтва Полацка і яго тэрытарыяльнае развіццё ў IX – XV стст. маюць істотныя адрозненні ад большасці гарадоў гэтага часу на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Канчанская сацыяльная арганізацыя і адпаведны тэрытарыяльны падзел у Полацку не склаліся. Апошняя ака-

лічнасць істотным чынам адрознівае Полацк ад большасці гарадоў Старажытнай Русі (Ноўгарада, Пскова, Ладагі, Смаленска і інш.), у якіх соценная сістэма як вызначальная рыса сацыяльнай арганізацыі гарадскіх канцоў існавала з XII ст. Абсалютная большасць насельніцтва Полацка жыла на гарадскіх пасадах. У Полацку з XI ст. галоўную ролю адыгрывалі вольныя гарадскія абшчыннікі, аб'яднаныя ў гандлёва-рамесныя карпарацыі накшталт "братчын". Пасля 1498 г. (прыняцце магдэбургскага права) асноўнае насельніцтва горада, за выключэннем духавенства і баяраў, стала называцца мяшчанамі. Юрыдычная перавага полацкага баярства над мяшчанамі зафіксавана ў пісьмовых крыніцах не раней за 80-я – 90-я гады XV ст. Адносна позна – у першай палове XVI ст. – у Полацку склалася соценная сістэма сацыяльнай арганізацыі пасадскага насельніцтва. У канцы XV ст. з'яўляюцца асобныя юрыдыкі на левабярэжных пасадах (Востраўскі, Крыўцоў, Слабадскі і Экіманскі). Пасля Інфлянцкай вайны ў 1580 г. насельніцтва Экіманскага пасада становіцца падначаленым полацкім езуітам і надалей утварае буйнейшую юрыдыку. У XVII стагоддзі жыхары Крыўцовага і Слабадскога пасадаў арганізацыйна аб'ядноўваюцца ў "сотню зарачанскую" Крыўцовага пасада. Частка насельніцтва Крыўцовага пасада, якая займалася рамёствамі і гандлем, становіцца падуладнай полацкаму магістрату толькі ў 1622 – 1623 гг.

7. На раннім этапе (канец VIII – X стст.) насельніцтва Полацка з'яўлялася поліэтнічным у выніку працэсу славянізацыі балтаў у Полацку і яго акрузе. Аб гэтым сведчаць знаходкі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (летапісных крывічоў) на полацкім гарадзішчы і паселішчах каля яго. У XI ст. у Полацку пераважала ўсходнеславянскае насельніцтва, якое з'яўлялася заснавальнікам і стваральнікам горада ў сацыяльна-эканамічным значэнні гэтага тэрміна. Вынікі антрапалагічнага вывучэння астэалагічнага матэрыялу, здабытага падчас археалагічных раскопак, і даныя пісьмовых крыніц сведчаць, што ў XVI – XVIII стст. насельніцтва Полацка пераважна паходзіла з яго акругі. Рэтраспектыўна тое ж можна адзначыць і для папярэдняга перыяду. Прозвішчы некаторых дынастый палачан тоесныя з назвамі населеных пунктаў павета і ваяводства (Заскаркі, Кубліцкія, Палупяты, Росіцы, Сялявы і інш.). У XVI – XVIII стст. у Полацку пражывалі рускія (выхадцы з маскоўскай дзяржавы), яўрэі, татары, немцы, вугорцы, палякі і іншыя са складу гандляроў, ваенных і рамеснікаў, якія на пэўны час траплялі ў Полацк.

8. Сляды разгалінаванай рамеснай вытворчасці фіксуюцца ў Полацку ў XI – XVIII стст. Археалагічна даследаваны і найбольш поўна прадстаўлены ювелірныя, кавальскія і касцярэзныя комплексы, зафіксаваны сляды ўсіх асноўных сярэдневяковых і новачасных рамёстваў, якія характарызуюць вытворчую дзейнасць гарадскога насельніцтва Беларусі. Полацк у XI – XVIII стст. з'яўляўся буйным гандлёвым цэнтрам. Значная частка насельніцтва Вялікага і

Запалоцкага пасадаў у XI – XIII стст. была задзейнічана ў арганізацыі гандлю. Выразныя сляды гандлёвай дзейнасці пасадскага насельніцтва фіксуюцца па матэрыяльных рэштках у культурных напластаваннях XVI – XVIII стст. У сукупнасці з данымі пісьмовых крыніц магчыма вызначыць ролю Полацка як аднаго з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў на тэрыторыі Беларусі ў XI – XVIII стст.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** У дысертацыі выкладзены вынікі даследавання аўтара, атрыманыя на падставе абагульнення вынікаў уласных археалагічных раскопак, а таксама аналізу самастойна апрацаванага археалагічнага матэрыялу з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (НПГКМЗ), Інстытута гісторыі НАН Беларусі (ІГНАНБ), архіва археалагічнай навуковай дакументацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Агульная колькасць апрацаваных артэфактаў перавышае 200 000 адзінак. У выніку археалагічных раскопак аўтара ўпершыню знойдзена серыя астэалагічных рэшткаў людзей, якія былі пахаваны ў XV – XVIII стст., прыведзены даныя антрапалагічнай экспертызы больш за 100 індывідаў.

На аснове вывучэння шырокага кола гістарычных крыніц і гістарыяграфіі вызначана, што генезіс пасяленчай структуры, сацыяльны і этнічны склад насельніцтва Полацка ў IX – XIII стст. мелі найбольшыя падабенствы з гарадамі Беларускага Падзвіння (Віцебск, Лукомль).

Распаўсюджаная ў гістарыяграфіі думка аб канчанскай структуры Полацка і падабенствах сацыяльнай арганізацыі пасадскага насельніцтва Полацка і Ноўгарада не знайшла пацвярджэння. Даказана, што соценная структура арганізацыі насельніцтва склалася ў Полацку не раней за XVI ст. і гэта было звязана з увядзеннем магдэбургскага права. Аб'яднанні рамеснікаў (брацтвы) дзейнічалі ў Полацку не пазней за XII ст., у XVII ст. яны былі трансфармаваны ў цэхі. Насуперак усталяванаму ў гістарыяграфіі меркаванню аб пераносе дзяцінца з гарадзішча на Верхні замак у сярэдзіне XI ст., прыводзяцца археалагічныя даныя аб захаванні гарадзішчам функцый дзяцінца да пачатку XIV ст. Адмаўляецца распаўсюджаны у гістарыяграфіі тэзіс пра існаванне княжацкай рэзідэнцыі на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Даказана, што статус развітога рамеснага цэнтра Полацк захоўваў у XI – XVIII стст.

На працягу 2000 – 2010 гг. аўтар праводзіў самастойныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі г. Полацка. Было адкрыта і археалагічна даследавана старажытнае пасадскае пасяленне XI – XII стст. на вялікай тэрыторыі (больш за 21 га), вызначаны гандлёва-рамесны статус насельніцтва, упершыню праведзена комплекснае археалагічнае вывучэнне левабярэжных пасадаў. Археалагічныя раскопкі праведзены на ўсіх гістарычных помніках Полацка. Раскапаная пад кіраўніцтвам аўтара плошча складае 1020 $м^2$ пры магутнасці культурных напластаванняў у сярэднім 2,5 – 3 м, падчас археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі на пасадскай тэрыторыі Полацка быў даследаваны культурны пласт на плошчы больш за 3000 $м^2$.

Аўтарам упершыню быў выкарыстаны метад радыёвугляроднага датавання для разгорнутай характарыстыкі найстаражытнейшых археалагічных комплексаў на полацкіх гарадзішчы і паселішчы. Упершыню археалагічна выяўлены культурны пласт банцараўска-тушамлінскай культуры ў г. Полацку на тэрыторыі будучага вакольнага горада. Археалагічна пацверджана наяўнасць стратыграфічнага пласта культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (крывічоў) другой паловы VIII – X стст. на полацкім гарадзішчы і паселішчах каля яго. Пры дапамозе археалагічных метадаў пацверджана існаванне летапіснага "града" Полацка ў IX ст. Упершыню археалагічна даказана існаванне вакольнага горада канца X – першай паловы XI ст., яго памеры і размяшчэнне. Пацверджана гістарыяграфічная канцэпцыя аб вядучай палітычнай і, як вынік, сацыяльна-эканамічнай ролі Полацка ў Беларускім Падзвінні ў IX – X стст.

Аўтарам самастойна апрацаваны архіўныя матэрыялы: актавыя кнігі полацкага магістрата, пісцовыя кнігі маскоўскай дзяржавы, інвентары маёмасці з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы, Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў. Абсалютная большасць навуковых публікацый падрыхтавана аўтарам без удзелу сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы і вынікі даследаванняў па тэме дысертацыі былі пакладзены ў аснову 22 дакладаў на наступных навуковых семінарах, канферэнцыях і кангрэсах: Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Архитектура и археология Древней Руси", прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння М.К. Каргера (1903 – 1976) (Санкт-Пецярбург, 2003); II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць" (Полацк, 2004); Рэспубліканскай археалагічнай канферэнцыі "Вынікі палявых археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2005 годзе" (Мінск, 2006); Рэспубліканскай канферэнцыі "Археалогія і матэрыяльная культура: інтэрпрэтацыя археалагічных даных" (Мінск, 2006); навуковай канферэнцыі "Археалагічны прадмет у музейным зборы: тыпалогія, храналогія, атрыбуцыя" (Мінск, 2006); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гістарычная спадчына шляху "з варагаў у грэкі" (Вісбі, 2007); Рэспубліканскай археалагічнай канферэнцыі "Вынікі палявых археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2006 годзе" (Мінск, 2007); V Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі" (Полацк, 2007); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Матэрыяльная культура насельніцтва Беларусі і сумежных рэгіёнаў у дагістарычную эпоху і сярэднявеччы" (Мінск, 2007); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Вынікі палявых археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2007 годзе" (Мінск, 2008); Рэспубліканскім навукова-практычным семінары "Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў" (Полацк, 2008); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Археала-

гічная навука: стан, метадалогія, перспектывы” (Мінск, 2008); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2008 годзе” (Мінск, 2009); ІІІ Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 380-годдзю Сімяона Полацкага (Полацк, 2009); навуковай канферэнцыі “Віцебскія старажытнасці” (Віцебск, 2009); ІІІ Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі “Гістарычная навука на пераломе эпох: дыялог з часам (да 80-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі) (Мінск, 2009); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2009 годзе” (Мінск, 2010); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Скарынаўскія чытанні” (Полацк, 2010).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя вынікі даследавання апублікаваны ў выглядзе 2 манаграфій: “Полацк XVI – XVIII стст.: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада” (Наваполацк, 2007), “Полацк і палачане (IX – XVIII стст.)” (Наваполацк, 2010) – 28,3 аўтарскіх аркушаў; 2 вучэбна-метадычных комплексаў: “Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў (Наваполацк, 2006), “Археалогія” (Наваполацк, 2009) – 14,05 аўтарскіх аркушаў, 28 артыкулаў у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (агульны аб’ём 28,6 аўтарскіх аркушаў), 10 артыкулаў у зборніках матэрыялаў канферэнцый, 4 артыкулы ў навуковых зборніках (аб’ём 17,2 аўтарскіх аркушаў). Агульная колькасць публікацый па тэме даследавання складае 46 найменняў (усяго 88,15 аўтарскіх аркушаў).

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Структура і аб’ём дысертацыі адпавядае мэце і задачам навуковага даследавання і патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, шасці глаў, якія ахопліваюць 19 раздзелаў і падраздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і двух дадаткаў з тапаграфічнымі апісаннямі і ілюстрацыямі. Агульны аб’ём дысертацыі – 410 старонак, з якіх: бібліяграфічны спіс – 31 старонка (397 назваў, з іх 17 замежных і 46 публікацый суіскальніка), дадатак А – 39 старонак (11 табліц з тапаграфічнымі апісаннямі), дадатак Б – 122 старонкі (ілюстрацыі).

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першай главе **“Гістарыяграфія і крыніцы”** вызначаецца ступень вывучанасці праблемы развіцця пасадаў Полацка ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, даецца характарыстыка крыніц, на аснове якіх пабудавана даследаванне.

**1.1 Гісторыя і гістарыяграфія археалагічнага вывучэння Полацка. Археалагічныя крыніцы.** Гістарычныя часткі Полацка складаюцца са старажытнага гарадзішча, паселішча-перадграддзя, паселішчаў за р. Палатой, Ніжняга і Верхняга замкаў, былых Вялікага, Запалоцкага і Крыўцовага пасадаў са слабодамі, Вострава, Экімані, а таксама Бельчыцкага Барысаглебскага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў.

Гісторыя археалагічнага вывучэння Полацка пачынаецца з 1928 г. (А.М. Ляўданскі). На той час уяўленне пра Полацк як пра горад са шматвекавой гісторыяй ніяк не было падмацавана археалагічнымі крыніцамі. А.М. Ляўданскі ўпершыню вызначыў месцапалажэнне старажытнага дзядзінца на полацкім гарадзішчы[1].

Археалагічнае вывучэнне Полацка працягваецца ў пасляваенны час. Пачатак яму паклала маштабнае будаўніцтва: у 1957 г. М.К. Каргер праводзіць археалагічныя даследаванні на месцы будаўніцтва аднаго з карпусоў гарадской бальніцы на Верхнім замку. Вынікі археалагічных раскопак адлюстраваны ў змесце справаздач, якія захоўваюцца ў архіве ІГНАНБ і з’яўляюцца каштоўнейшымі гістарычнымі крыніцамі.

Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Верхняга замка прадоўжыліся і ў наступныя гады. Вывучэнне полацкіх пасадаў пачалося ў выніку працы экспедыцый Інстытута гісторыі АН БССР (1959 г., А.Р. Мітрафанаў, Л.Д. Побаль).

Першая рэканструкцыя тапаграфічнай структуры Полацка ў IX – XIII стст. была прадстаўлена Л.В. Аляксеевым[2], які зрабіў грунтоўны аналіз пісьмовых крыніц, аднак вынікі археалагічных даследаванняў былі яшчэ вельмі абмежаваныя. У апошніх публікацыях Л.В. Аляксееў крытычна паставіўся да найноўшай гістарыяграфіі гісторыі Полацка[3].

З 1961 па 1964 г. і ў 1967 – 1968 гг. археалагічныя даследаванні ў Полацку праводзіліся Г.В. Штыхавым[4]. Было вызначана, што старажытным дзяцінцам Полацка з’яўлялася гарадзішча IX ст. На правым беразе р. Палаты,

[1] Ляўданскі, А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А.М. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук БАН. Кн. 2. Працы археолёгічнай камісіі. Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 172.
[2] Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии) в IX – XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 296 с. : ил.
[3] Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси : очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л.В. Алексеев ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – Кн. 1. – 2006. – 289 с. ; Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси : очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л.В. Алексеев ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – Кн. 2. – 2006. – 167 с.
[4] Штыхов, Г.В. Города северной и центральной Белоруссии / Г.В. Штыхов // Очерки по археологии Белоруссии. Ч. II. – Минск : Наука и техника, 1972. – С. 73 – 95 ; Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с. : ил. ; Штыхов, Г.В. Киев и древние города Белоруссии / Г.В. Штыхов // Древнерусское государство и славяне. – Минск, 1983. – С. 56 – 57.

каля гарадзішча, было размешчана паселішча-перадграддзе плошчай 0,25 $га^2$. Верхні замак пачаў засяляцца напрыканцы X ст. У той жа час адбывалася станаўленне пасадаў Полацка (Запалоцкі і Вялікі пасады). У першай палове XI ст. Верхні замак становіцца адміністрацыйным цэнтрам горада. Г.В. Штыхавым праведзены аналіз развіцця рамёстваў і гандлёвых сувязяў насельніцтва старажытнага Полацка.

Маштабы археалагічных раскопак 1928, 1957, 1959 – 1964 гг. і 1967 – 1968 гг. былі вельмі значнымі (усяго вывучана больш за 964 $м^2$ плошчы).

У 1970-я гг. увага археолагаў была засяроджана пераважна на вывучэнні помнікаў полацкай школы дойлідства на Верхнім і Ніжнім замках і на тэрыторыі Бельчыцкага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў (Вал.А. Булкін, П.А. Рапапорт).

Наступны этап вывучэння Полацка прыпадае на 1980-я – 1990-я гг. У 1979 – 1980 гг. Г.В. Штыхаў правёў раскопкі старажытнага паселішча каля Чырвонага маста і ў Запалоцці. У 1986 г. у Полацку пачынаюць працаваць экспедыцыі Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам С.В. Тарасава. На працягу 1986 – 1993 гг. раскопкі праводзіліся штогадова.

У выніку праведзеных археалагічных даследаванняў С.В. Тарасава 1980-х – першай паловы 1990-х гг. былі зроблены высновы адносна развіцця тапаграфіі Полацка IX – XVII стст., зоны распаўсюджвання культурнага пласта гістарычнага цэнтра, характару асноўных абарончых збудаванняў гарадскіх пасадаў. Вызначаны чатыры этапы тэрытарыяльнага пашырэння горада[5].

У 1986, 1989 – 1992, 1996 – 1997 гг. археолага-архітэктурныя даследаванні на тэрыторыі Вялікага пасада ў г. Полацку праводзілі Н.І. Здановіч, П.А. Русаў, Г.М. Сагановіч. Экспедыцыі ставілі мэтай вызначэнне ступені захаванасці помнікаў архітэктуры, якія траплялі ў зону новабудоўлі[6].

---

[5] Тарасаў, С.В. Вялікі пасад у Полацку / С.В. Тарасаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1988. – № 4. – С. 18 – 21 ; Тарасаў, С.В. Да пытання аб тапаграфіі Полацка IX – XI стст. / С.В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі (далей – ГАППЗ) : матэрыялы III міжнар. навук. канф. – Полацк : Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ; ПГУ, 1998 . – С. 298 – 303 ; Тарасаў, С.В. Дэмаграфічная структура Полацка XI – XVII стст. па гісторыка-археалагічным крыніцам / С.В. Тарасаў // ГАППЗ. – С. 59 – 61 ; Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст. : Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 183 с. : іл. ; Тарасаў, С.В. Полацкі Верхні замак / С.В. Тарасаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі (далей – АіНБ) ; Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 508 ; Тарасаў, С.В. Полацкі Вялікі пасад / С.В. Тарасаў // АіНБ. – С. 508 ; Тарасаў, С.В. Полацкі Запалоцкі пасад / С.В. Тарасаў // АіНБ. – С. 509 ; Тарасов, С.В. К вопросу о развитии топографической структуры Полоцка IX – XVII вв. / С.В. Тарасов // История и археология Полоцка и Полоцкой земли (к 1125-летию г. Полоцка) (далей – ИАППЗ). – Полоцк, 1987. – С. 59 – 61 ; Тарасов, С.В. Раскопки на Великом посаде в г. Полоцке / С.В. Тарасов, Г.Н. Романенкова // ИАППЗ. – С. 62 – 63 ; Тарасов, С.В. Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI – XVIII вв.) / С.В. Тарасов // Памятники науки и техники, 1987 – 1988. – М. : Наука, 1989. – С. 164 – 175.

[6] Здановіч, Н.І. Да пытання рэканструкцыі старажытнай забудовы Полацка / Н.І. Здановіч // ГАППЗ : матэрыялы IV міжнар. навук. канф. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 131 – 137 ; Здановіч, Н.І. Комплекс рэчаў з пабудовы XVI ст. з Полацка / Н.І. Здановіч // ГАППЗ : матэрыялы III міжнар. навук. канф. – Полацк : Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ; ПГУ, 1998. – С. 125 – 140.

З 1995 г. пачынаецца археалагічнае вывучэнне Полацка на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (у гэты год былі праведзены раскопкі М.В. Клімава і С.В. Тарасава на Верхнім замку, у 1996 г. – раскопкі М.В. Клімава[7]).

З 2000 г. на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта сталі праводзіцца штогадовыя раскопкі (кіраўнік – Д.У. Дук). Усяго было археалагічна даследавана 1020 м², з іх 44 м² – на полацкім гарадзішчы. З 2000 г. падчас археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі на пасадскай тэрыторыі Полацка быў вызначаны характар культурнага пласта на плошчы каля 3000 м².

З 2008 г. у г. Полацку пачала дзейнічаць комплексная археалагічная экспедыцыя Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка[8] (кіраўнік – В.М. Ляўко)[9].

Найбольш значныя археалагічныя адкрыцці пачатку XXI ст. – гэта даследаванне паўднёвай часткі абарончай сцяны вакольнага горада XI ст., вызначэнне плошчы Запалоцкага пасада XI – пачатку XIII стст. і пасяленняў за р. Палатой, удакладненне этапаў існавання і характарыстыкі заняткаў насельніцтва старажытных гарадзішча і паселішча, адкрыццё шэрага рамесных майстэрняў XII – XVIII стст., вызначэнне этапаў існавання і плошчы левабярэжных пасадаў Полацка[10].

Агульная плошча культурных напластаванняў, якія былі стацыянарна даследаваны археолагамі на тэрыторыі полацкіх пасадаў, склала 6196 м². Найбольш даследаванай з’яўляецца тэрыторыя Вялікага пасада (ускрыта 5044 м² плошчы), на тэрыторыі Запалоцкага пасада раскапана плошча 772 м², на тэрыторыі Вастраўскага і Экіманскага пасадаў раскапаная археолагамі плошча складае больш за 80 м², селішча каля Чырвонага маста раскапана на плошчы 276 м². Крыўцоў пасад археалагічна даследаваўся непасрэдна на тэрыторыі Барысаглебскага манастыра (зафіксавана стратыграфія дзвюх скразных будаўнічых

---

[7] Клімаў, М. Археалагічныя працы 1996 года на Востраве ў Полацку / М. Клімаў // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. V (Вып. 5) ; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – С. 46 – 49.

[8] Соловьёв, А.А. Археологическое исследование дома № 15 по ул. Толстого в г. Полоцке при проведении ремонтных работ / А.А. Соловьёв // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навуковадаследчай работы ў 2004 г.). – Полацк : НПГКМЗ, 2004. – С. 64 – 78 ; 204 Соловьёв, А.А. Итоги археологического надзора за ремонтом теплотрассы на ул. Войкова в г. Полоцке / А.А. Соловьёв // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2007 годзе. – Мінск : ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”, 2009. – Вып. 17. – С. 261.

[9] Левко, О.Н. Полоцк – древнейший центр белорусской государственности и актуальные проблемы отечественной истории / О.Н. Левко // Вестн. Полоц. гос ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 7 – 16.

[10] Дук, Д.У. Гісторыя Полацка : па матэрыялах археалагічных даследаванняў : вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01-01 01 “Гісторыя Беларусі”, 1-02 01 02-04 “Гісторыя. Англійская мова” / Д.У. Дук. – Наваполацк : УА “ПДУ”, 2006. – 112 с. ; Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў : нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с. : іл. ; Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX – XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с. [22] арк. іл. ; Штыхаў, Г.В. Дасягненні і перспектывы археалагічнага вывучэння Полацка / Г.В. Штыхаў // ГАППЗ : матэрыялы V міжнар. навук. канф., Полацк, 24 – 25 кастрыч. 2007 г. – Полацк : НПГКМЗ, 2009. – С. 352 – 357.

траншэй) і падчас раскопак у 2009 г. (плошча 24 м²). Падчас пракладання інжынерных сетак была зроблена фіксацыя культурных напластаванняў гэтага помніка, акрэслены межы манастыра. Сумарна пад археалагічны нагляд на тэрыторыі ўсіх пасадаў Полацка трапіла плошча каля 20000 м².

**1.2 Пісьмовыя, картаграфічныя і выяўленчыя крыніцы.** Акрамя археалагічных крыніц, у дысертацыі выкарыстаны пісьмовыя, выяўленчыя і картаграфічныя крыніцы. Пісьмовыя крыніцы ў вывучэнні Полацка даюць звесткі па гарадской тапаграфіі, сацыяльнай арганізацыі пасадскага насельніцтва, аб'ектах нерухомасці і інш. (старажытнарускія летапісы, полацкія граматы, матэрыялы бягучага справаводства з полацкіх магістрацкіх кніг XVI – XVIII стст., прывілеі вялікіх князёў Аляксандра і Жыгімонта I Полацку на магдэбургскае права 1498 і 1529 гг., рэвізія г. Полацка 1552 г. і паезуіцкіх маёнткаў 1774 г., кніга полацкага пахода 1563 г., наратыўныя крыніцы П. Одэборна і Р. Гейдэнштэйна і інш.).

Картаграфічныя крыніцы прадстаўлены трыма планамі Полацка 1579 г., планамі 1707 г., 1720-х гг., 1778, 1779, 1779 – 1786 гг. і планамі XIX – XX стст.

З новых выяўленчых крыніц адзначым адкрытыя ў апошнія гады выявы фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст. у г. Полацку і фрэскі з выявай Полацка сярэдзіны XVI ст. Віленскага касцёла святых Францішка і Бернардзіна, абраз св. Мікалая сярэдзіны XVIII ст. з фондаў НПГКМЗ.

Сярод архіўных пісьмовых крыніц важнае месца займаюць матэрыялы бягучага справаводства, змешчаныя ў складзе актавых кніг полацкага магістрата 1650 – 1772 гг. і полацкага гарадавога магістрата (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). У табліцы I дадатку А дысертацыі змешчана апісанне археалагічных аб'ектаў, адкрытых па вул. Ф. Міронавай і Кастрычніцкай у г. Полацку ў 2005 – 2007 гг. Поўныя тапаграфічныя звесткі паводле аналізу актавых кніг за 1656 – 1657 гг., 1704, 1721, 1779, 1781, 1782 гг. прадстаўлены ў табліцах II – XI дадатку А.

У працы над дысертацыяй выкарыстаны матэрыялы фонду Мяніцкіх, які захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве, фонду "Літоўская метрыка" Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў.

Дысертацыя пабудавана на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці. За аснову выкладання матэрыялу вызначаны прыярытэт дакументальных фактаў. Падчас працы над дысертацыяй былі выкарыстаны апісальны, гісторыка-параўнальны (кампаратыўны), картаграфічны, праблемна-храналагічны, статыстычны і рэтраспектыўны метады даследавання, а таксама метады археалагічнага датавання – тыпалагічны, стратыграфічны, гісторыка-культурны. Для датавання археалагічных комплексаў выкарыстоўваўся метад радыёвугляроднага аналізу.

**1.3 Культурны пласт і бытавая кераміка.** Культурны пласт – гэта важная гістарычная крыніца па рэканструкцыі пытанняў тапаграфіі, характарыстыкі сацыяльнага статусу жыхароў сярэдневяковага горада, умоў жыцця і характару іх дзейнасці. Археалагічныя метады даследавання культурнага пласта з'яўляюцца адзіна магчымымі ў яго вывучэнні. Неацэннае значэнне археалагічных даных у рэканструкцыі гісторыі Полацка прыходзіцца на перыяд сярэдневякоўя (VI –XV стст.), па гэтым перыядзе корпус пісьмовых крыніц мае фрагментарны характар.

Бытавая кераміка – гэта самая распаўсюджаная катэгорыя археалагічных знаходак, і на сённяшні дзень яе вывучэнне дае магчымасць атрымаць даныя пра распаўсюджванне раннегарадскіх напластаванняў на падставе знаходак ляпной керамікі (другая палова VIII – X стст.), напластаванняў, сінхронных па часе знаходкам гаршкоў, зробленых на ручным ганчарным крузе (сярэдзіна X – XVI стст.) і нажным крузе (XVII – XVIII стст.). Сярод бытавой керамікі асноўная колькасць – гэта кухонны посуд, прадстаўлены пераважна рэшткамі гаршкоў.

Культурны пласт з ляпной керамікай даследаваны на тэрыторыі полацкага гарадзішча і двух паселішчаў каля яго. На гарадзішчы адкрыты пласт з ляпной керамікай днепра-дзвінскай культуры. Культурны пласт з ляпной керамікай трэцяй і апошняй чвэрці I тыс. на гарадзішчы захаваўся ў моцна перамяшаных напластаваннях ніжняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта. Пласт з ляпной керамікай выяўлены на тэрыторыі селішча – перадграддзя на плошчы 0,24 га. Асноўны па плошчы (каля 6 га) культурны пласт з ляпной керамікай банцараўска-тушамлінскай культуры і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў быў даследаваны ў паўночнай частцы Ніжняга замка. Прадстаўлена тыпалогія ляпной керамікі з Ніжняга замка (4 групы). Ляпная кераміка з Запалоцця прадстаўлена двума венцамі гаршкоў. Ляпная кераміка, выяўленая на тэрыторыі на ўсход ад паркана Вялікага пасада, паходзіць з былых курганных пахаванняў (валатовак), якія існавалі ў IX – XVIII стст.

Культурны пласт XI – XIII стст. вылучаны на тэрыторыі Верхняга замка, Вялікага і Запалоцкага пасадаў, у Старой Слабадзе на левым беразе Дзвіны, лакальна – на Востраве. Тыпалогію бытавой керамікі XI – XVI стст. па матэрыялах "усходніх раскопаў" на Верхнім Замку прапанаваў Г.В. Штыхаў. Даследчык вылучыў 6 тыпаў гаршкоў (I – VI). Гэтая тыпалогія істотным чынам дапоўнена тыпалогіяй гаршкоў з полацкага гарадзішча, зробленай па выніках раскопак у 2007 г. (тыпы А, Б, В, Г, Д, Е, Ж, З, К).

Культурны пласт XIV – XV стст. у Полацку практычна не захаваўся. Напластаванні XV ст. даследаваны на тэрыторыі былога Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра і ўсходняй часткі Верхняга замка. Лакальна пласт даследаваны ў межах закрытых археалагічных комплексаў.

Геаграфія распаўсюджвання культурнага пласта XVI – XVIII стст. неаднародная. Напластаванні XVI – XVIII стст. вылучаюцца на тэрыторыі Вялікага пасада, на Крыўцовым пасадзе, Старой Слабадзе і лакальна – у Запалоцці, Верхнім і Ніжнім замках. Гэты пласт адсутнічае ў заходняй частцы Запалоцкага пасада. Прадстаўлена тыпалогія керамікі, зробленай на ручным ганчарным крузе (група 1, XIV – XVI стст.) і нажным крузе (група 2, XVII – XVIII стст.).

Зроблена выснова, што кераміка культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў бытуе ў Полацку з 780-х гг. да канца X ст. З сярэдзіны X ст. большая частка ляпнога посуду прадстаўлена падпраўленымі на ручным ганчарным крузе венцамі гаршкоў. Раннеганчарная кераміка XI ст. тыпу I па Г.В. Штыхаву і тыпаў Г[11] і К з гарадзішча з'яўляецца самай архаічнай. Гаршкі гэтых тыпаў у культурным пласце Полацка знойдзены на плошчы 180 га.

У XI ст. ганчарны посуд безумоўна дамінуе. Масавае ўкараненне тэхналогій вырабу на нажным ганчарным крузе назіраецца ў Полацку ў першай трэці XVII ст., хаця выкарыстанне ганчарнага круга адбывалася з канца XVI ст. З таго часу шырока выкарыстоўваецца і паліваная кераміка.

У другой главе **“Полацк у сістэме станаўлення і развіцця сацыятапаграфічнай структуры старажытнарускіх гарадоў IX – XIII стст.”** Аналізуюцца асаблівасці развіцця Полацка ў сістэме станаўлення сацыятапаграфічнай структуры раннегарадскіх цэнтраў Старажытнай Русі (Ладага, Ізборск, Ноўгарад, Пскоў, Віцебск, Лукомль).

Археалагічныя раскопкі ў 2007 – 2008 гг. далі новы матэрыял для вызначэння датавання раннегарадскіх стратыграфічных напластаванняў Полацка на гарадзішчы і вакольным горадзе. Прадстаўлены матэрыялы археалагічных раскопак, на аснове якіх быў вызначаны бесперапынны характар існавання жыцця на полацкім гарадзішчы з сярэдзіны I тыс. да н. ч. да пачатку XIV ст. (артэфакты і культурныя напластаванні днепра-дзвінскай, банцараўска-тушамлінскай археалагічных культур і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, серыя радыёвугляродных дат).

Прадстаўлены погляды гісторыкаў на праблему этнічнай прыналежнасці культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (Л.В. Аляксееў, Э.М. Загарульскі, В.М. Ляўко, В.В. Сядоў, Я.А. Шмідт, Г.В. Штыхаў і інш.). За аснову прынята палажэнне аб этнічнай прыналежнасці носьбітаў дадзенай культуры да славян. Поліэтнічны склад насельніцтва полацкай зямлі-воласці ў X – XI стст. абумовіў спецыфіку станаўлення дзяржаўнасці крывічоў-палачан.

Зроблена выснова, што Полацк з'яўляецца адным з самых старажытных гарадоў на тэрыторыі Старажытнай Русі. Археалагічны матэрыял пацвярджае даныя летапісных крыніц аб існаванні Полацка ў IX – X стст. разам з такімі летапіснымі “градамі”, як Ладага, Ноўгарад (Рурыкава гарадзішча), Ізборск, Пскоў.

[11] Тып Г гаршкоў з полацкага гарадзішча адпавядае тыпу I гаршкоў з Верхняга замка.

Скандынаўскае насельніцтва не аказала істотнага ўплыву на развіццё ранніх пасяленчых структур Полацка ў параўнанні з Ладагай і Ноўгарадам. Стратыграфія культурнага пласта і матэрыяльная культура другой паловы І тыс. мае найбольшыя падабенствы менавіта з гарадамі Беларускага Падзвіння (Віцебскам і Лукомлем). Адмаўляецца гістарыяграфічны тэзіс пра існаванне княжацкай рэзідэнцыі XII ст. на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, тэзіс аб пераносе дзяцінца з гарадзішча на Верхні замак у XI ст.

Станаўленне сярэдневяковага Полацка ў сацыяльна-эканамічным разуменні прыпадае на сярэдзіну XI ст., тое ж можна адзначыць і ў дачыненні да іншых гарадоў Старажытнай Русі (Ноўгарад, Ізборск, Пскоў). Віцебск у XI ст. вылучаецца як удзельны “прыгарад” Полацка, а рысы развітага гандлёва-рамеснага пасялення з функцыямі ўласна горада набывае не раней за XII ст.

У трэцяй главе **“"Дзяцінец", "пасад" і "замак" у сацыяльнай тапаграфіі Полацка IX – XVIII стст.”** разглядаюцца асноўныя структурныя элементы ўсходнеславянскага горада на прыкладзе Полацка.

**3.1 Функцыі і статус замкаў у сацыятапаграфічнай структуры горада.** Разглядаецца паходжанне тэрміна “дзяцінец”. Прыводзіцца аналіз звестак археалагічных і пісьмовых крыніц аб статусе гарадзішча і Верхняга замка Полацка.

*Дзяцінец* Полацка ў IX – XIII стст. існаваў на старажытным полацкім гарадзішчы, а з пачатку XIV ст. яго функцыі стаў выконваць Верхні замак. Прадстаўлена стратыграфія культурнага пласта і храналогія знаходак з гарадзішча па выніках раскопак у 2007 г. Вызначана, што Верхні замак у XI – пачатку XIV ст. з’яўляўся старажытным сакральным цэнтрам, які выкарыстоўваўся і для адміністрацыйна-цырыманіяльных мэтаў (Сафійскі сабор). Верхні замак мог з’яўляцца месцам дзейнасці князя (XI – XIV стст.) і яго пражывання (пасля 1326 г.). У гэты час узводзіцца княжацкі церам. На Верхнім замку жылі княжацкі намеснік (з 1392 г.), ваявода (з 1504 г.), уладыка, баяры і мяшчане, тут жа размяшчаўся шэраг манастыроў.

Адміністрацыйны цэнтр горада пасля надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.) паступова быў перанесены на гарадскую плошчу ў будынак ратушы. Верхні замак па-ранейшаму заставаўся сакральным цэнтрам і самай значнай полацкай крэпасцю. Захоп гэтай фартэцыі ў 1563 г. азначаў страту Полацка войскамі ВКЛ.

У 1563 г., падчас панавання ў горадзе войскаў Івана IV, быў пабудаваны Ніжні замак. На падставе даных пісьмовых і археалагічных крыніц прадстаўлена рэканструкцыя ўзвядзення Ніжняга замка, перапланіроўкі старажытнага гарадзішча ў выніку змены русла р. Палаты. Абарончую функцыю Ніжні замак страчвае ў пачатку XVIII ст. і з таго часу становіцца месцам жыхарства маргінальнай часткі насельніцтва Полацка.

**3.2 Дэтэрмінацыя паняцця “пасад” і этапы тэрытарыяльнага пашырэння полацкіх пасадаў.** Раскрываецца сутнасць паняццяў “пасад”, “вакольны горад”, “перадграддзе”, “канец”. Пачатак *станаўлення* пасадаў Полацка і іншых найстаражытнейшых усходнеславянскіх гарадоў варта разглядаць з IX – X стст., калі вакол “града” існавалі неўмацаваныя паселішчы.

Вакольны горад Полацка – гэта прадцеча існавання Вялікага пасада. У дачыненні да Полацка адзначаецца, што вакольны горад (“малы пасад”) існаваў у першай палове XI ст.

У Полацку з сярэдзіны XI да пачатку XVI ст. існавалі два асноўныя горадаўтвараючыя пасады – Вялікі і Запалоцкі. Абодва пасады былі ўмацаваны. Плошча Вялікага пасада заставалася практычна нязменнай на працягу XII – XVII стст. і складала каля 50 – 60 га, межы Запалоцкага пасада істотна вагаліся ў бок скарачэння, што было выклікана частымі войнамі з Маскоўскім княствам (з 40 да 17 га).

Тапаграфічная структура левабярэжных пасадаў – Крыўцова і Экіманскага – была сфарміравана ў пачатку XVI ст. Згаданыя ў полацкай рэвізіі 1552 г. Слабадскі і Востраўскі пасады ў XVII ст. юрыдычна становяцца часткай Крыўцовага пасада пад найменнем асобных мясцовасцей. Гэтыя тэрытарыяльныя адзінкі былі заселены да часу ўтварэння левабярэжных пасадаў як полацкія слабоды, з цягам часу яны становяцца пасяленнямі пры манастырах Барыса і Глеба і Іаана Прадцечы. Сумарная плошча левабярэжных пасадаў у XVI ст. дасягала 40 га.

У чацвёртай главе **“Сацыяльная арганізацыя, склад і кіраванне пасадскага насельніцтва”** разгледжаны сацыяльная стратыфікацыя, крыніцы фарміравання і прынцыпы кіравання пасадскага насельніцтва.

Пасадскае насельніцтва Полацка ў XI – XIII стст. складалася пераважна з асабіста вольнага насельніцтва – рамеснікаў і гандляроў. Асаблівы статус мелі малодшыя дружыннікі (“дзецкія”) і баяры (“сільныя мужы”). Апошнія разам з самай шматлікай катэгорыяй асабіста вольнага насельніцтва – рамеснікамі і гандлярамі – складалі асноўную частку палачан. Дзецкія жылі пры двары князя, і да пачатку XIV ст. іх прысутнасць разам з князем і рамеснікамі зафіксавана на тэрыторыі полацкага гарадзішча. Слядоў баярскіх сядзіб на пасадскай тэрыторыі ў XI – XV стст. археалагічна не выяўлена, чаго нельга сказаць пра XVI – XVII стст. (зафіксаваны сядзібы баяр-шляхты Вялікага і Запалоцкага пасадаў, Верхняга замка).

Бяднейшай часткай насельніцтва старажытнарускіх гарадоў з’яўляліся рамеснікі-халопы, “міласнікі” (жабракі).

Да сярэдзіны XII ст. (1147, 1172 гг.) летапісы не паведамляюць пра існаванне канчанскай структуры асобных старажытнарускіх гарадоў. Тэрмін “пасад” згадваецца ў 1234 г. Канчанская структура была характэрна для Кіева, Ноўгарада, Пскова, Растова, Ладагі, Старай Русы, Смаленска і некаторых іншых.

Пісьмовыя крыніцы XV – XVI стст. і больш ранняга часу не паведамляюць аб наяўнасці канчанскай структуры Полацка. Полацкае баярства і вечавы лад у XII ст. набылі вялікую магутнасць, аднак значнай карпаратыўнасці баярскіх родаў накшталт наўгародскіх у Полацку не назіраецца. Інстытут княжацкай улады захоўваўся ў Полацку да канца XIV ст. Соценная структура арганізацыі пасадскага насельніцтва адлюстравана ў пісьмовых крыніцах XVI – XVII стст. У гэты час абазначылася перавага баяраў над мяшчанамі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці Полаччыны. У гэты ж час у Полацку знікаюць вечавыя сходы як своеасаблівы тып грамадзянскай улады, дзе пэўную ролю ў XIII – XIV стст. маглі адыгрываць таксама і беззямельныя мяшчане, але ўжо пад уладай князя ці вялікакняжацкага намесніка. Гэтая апошняя асаблівасць вылучае грамадскі лад Полацка ад уладкавання іншых усходнеславянскіх гарадоў.

Асобныя органы гарадскіх улад, якія б дзейнічалі пастаянна, у Полацку не былі створаны да часу ўвядзення магдэбургскага права (1498 г.). Пасля 1498 г. мяшчанская абшчына вылучаецца са складу насельніцтва зямлі.

Самае высокае становішча ў Полацку ў XVI – пачатку XVII ст. займалі баяры (з XVII ст. – шляхта). У Полацку да вышэйшага саслоўя ў XVI – XVIII стст. належалі асобныя мяшчане. У іх лік уваходзілі землеўласнікі і купцы. Тэрмін “мяшчане” ў інтытуляцыі гарадскіх зваротаў сустракаецца з 1459 года.

Сярэдні слой гараджан (“паспалітыя людзі месцкія”) прадстаўлялі майстры, падмайстры, вучні з ліку паўнапраўных гараджан, гандляры, уласнікі крам на рынках. Маргінальныя групы гарадской беднаты (“лёзныя”, “жабракі”) складалі да 10 % насельніцтва.

Крыніцай папаўнення гарадскога насельніцтва з’яўлялася ў першую чаргу сельская акруга. Прозвішчы некаторых палачан тоесныя з назвамі населеных пунктаў павета і ваяводства (Заскаркі, Кубліцкія, Палупяты, Росіцы, Сялявы і інш.). Мясцовае паходжанне пахаваных на полацкіх могілках у XVII – XVIII стст. людзей пацвярджаюць і даныя антрапалагічнай экспертызы.

У XVI – XVIII стст. у Полацку пражывалі маскавіты (выхадцы з маскоўскай дзяржавы), яўрэі, татары, немцы, вугорцы, палякі і іншыя са складу гандляроў, ваенных і рамеснікаў, якія на пэўны час траплялі ў Полацк.

У пятай главе **“Дынаміка гарадскіх пасадаў Полацка ў IX – XVIII стст.”** даследуецца дынаміка развіцця полацкіх пасадаў.

**5.1 Асаблівасці раннегарадской забудовы Полацка ў IX – X стст.** Планіровачная структура Полацка IX – X стст. вывучана па матэрыялах раскопаў на старажытным полацкім гарадзішчы, селішчы каля Чырвонага маста, Ніжнім замку і на плошчы Свабоды.

Жыццё на гарадзішчы было распачата ў першай палове I тыс. да н. ч. Захаваўся культурны пласт днепра-дзвінскай культуры. Сляды пажару, зной-

дзеныя на месцы раскопак на полацкім гарадзішчы ў 2009 г., сведчаць на карысць таго, што ў першай палове IX ст. гарадзішча мела драўляныя пабудовы.

Вакольны горад Полацка размяшчаўся ў першай палове XI ст. на поўдзень ад гарадзішча на месцы старажытнага паселішча VIII – X стст. (тэрыторыя сучаснага стадыёна "Спартак" і Ніжняга замка з прылеглай мясцовасцю). Плошча вакольнага горада складала 12,5 га.

На правым беразе р. Палаты размяшчалася селішча-перадграддзе плошчай каля 0,25 м$^2$. У 2007 г. адкрыты першыя сляды забудовы на правым беразе р. Палаты, дзе, верагодна, размяшчалася другое селішча-перадграддзе. Полацк IX – X стст. развіваўся ў веерным накірунку з цэнтрам на гарадзішчы.

Раннія сядзібныя комплексы мелі плошчу каля 90 – 100 м$^2$. Раннесярэдневяковы Полацк меў агульную колькасць насельніцтва каля 4 тыс. чалавек. Наяўнасць слядоў ювелірнай і кавальскай вытворчасці сведчыць пра рамесны характар насельніцтва вакольнага горада ў X – XI стст. Палачане ў X – пачатку XI ст. сяліліся ў зрубных дамах каркасна-слупавой канструкцыі з печамі-каменкамі.

**5.2 Развіццё полацкіх пасадаў у XI – XV стст.** Плошча Полацка ў другой палове XI – XV ст. з улікам апошніх даных складалася з асноўных тэрытарыяльных адзінак – Вялікага (каля 60 га[12]) і Запалоцкага пасада (максімальны памер – 40 га), Верхняга замка (9,44 га), Ніжняга замка (каля 7 га), гарадзішча – каля 2 га, паселішчаў за р. Палатой – да 50 га, Вострава – каля 8 га, Старой Слабады – каля 5 га. У выніку плошча Полацка ў XI ст. была не меншай за 180 га, у XII – XIII стст. адбываецца паступовае яе скарачэнне за кошт пасяленняў за р. Палатой і часткі Запалоцкага пасада на 70 га. Методыка падлікаў колькасці насельніцтва грунтуецца на даных археалагічных крыніц пры поўнай адсутнасці пісьмовых. Вызначаная гісторыкамі колькасць насельніцтва вагаецца ад 8 да 15 тыс. чалавек у залежнасці ад плошчы пасадскай тэрыторыі.

Упершыню згадка пра полацкія вуліцы фіксуецца ў "Аповесці мінулых часоў" пад 1092 г. Тут жа прыводзяцца назвы дамоў – "хоромины". Летапісныя паведамленні не вызначаюць назвы вуліц.

Забудова Полацка XI – XIII стст. найлепш вывучана па матэрыялах "усходніх" раскопаў на сучасным Верхнім замку. У даследуемы час сядзібная забудова размяшчаецца на пасадскай тэрыторыі *каля* Верхняга замка і ўяўляе прыклад развіцця пагоннай дваровай забудовы ўласна пасадскай тэрыторыі. Яе асаблівасцю напрыканцы X ст. з'яўляецца наяўнасць наземных зрубных жытлаў з печамі-каменкамі, у XI – XII стст. печы сталі рабіць глінабітнымі. У XIII ст. адбываецца ўшчыльненне забудовы, што прывяло да больш інтэнсіўнага росту культурных напластаванняў. Працягласць існавання аднаго будаўнічага гарызонта складала ў сярэднім 10 гадоў.

---

[12] З улікам тэрыторыі пазнейшага Ніжняга замка – каля 7 га.

Даных аб забудове Полацка ў XIV – XV стст. значна менш. Выкарыстоўваючы метад рэтраспекцыі і аналізуючы наяўны матэрыял, магчыма вызначыць, што ў асноўных рысах забудова Полацка мала чым адрознівалася ад папярэдняй XI – XIII стст.

**5.3 Полацкія пасады ў XVI – XVIII стст.** У 1498 г. Полацк атрымлівае магдэбургскае права. Для сацыяльнай тапаграфіі горада гэта азначала змены ў забудове і планіроўцы гарадской тэрыторыі (узвядзенне ратушы і будынкаў грамадскага прызначэння, перанос гарадской плошчы, рэгламентацыя грамадзянскай прыватнаўласніцкай забудовы). У XVI – першай трэці XVIII ст. пераважала драўляная грамадзянская і культавая забудова, пазней узнікае і развіваецца ансамбль мураваных храмаў і цагляных дамоў.

Полацк у XVI – XVIII стст. перажыў розныя этапы палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця. За гэты час з найбуйнейшага горада ВКЛ, цэнтра намесніцтва (прыкладна да 1504 г.) і ваяводства (з 1504 па 1772 г.), ён у выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэформ канца XVIII ст. пераўтварыўся ў павятовы горад у складзе Расійскай Імперыі. У 1772 г. Полацк становіцца адміністрацыйным цэнтрам правінцыі ў складзе Пскоўскай губерні, з 1776 г. – губернскім горадам, з 1778 па 1796 г. Полацк з’яўляецца цэнтрам намесніцтва, пасля чаго пераўтвараецца ў павятовы горад спачатку Беларускай, а пасля 1802 г. – Віцебскай губерні.

У гістарычнай літаратуры плошча Полацка ў гэты час пазначаецца як роўная ў XVII ст. – 200 га, у XVIII ст. – 112 га. Сёння магчыма вызначыць, што ў XVII – XVIII стст. плошча Полацка складала каля 250 га.

Асноўную частку гарадской тэрыторыі ўтваралі пасады, сумарная плошча Верхняга (з XI ст.) і Ніжняга замкаў (з 1563 г.) не перавышала 13 га. Пэўныя ваганні ў бок скарачэння адбываліся ў XVI ст. за кошт тэрыторый Запалоцкага і Вялікага пасадаў. Колькасць насельніцтва горада ў гэты час таксама даволі істотна вагалася. У першай палове XVI ст. у Полацку жыло крыху больш за 10 тыс. чалавек, прыкладна столькі ж складала насельніцтва горада ў першай палове XVII ст.; 700 чалавек засталося ў час ваеннага ліхалецця 1654 г.; у 30-я – 40-я гг. XVIII ст. у Полацку пражывала прыкладна 3 – 4 тыс. чалавек; па даных за 1805 г. колькасць гарадскога насельніцтва складала 2991 чалавек. Рэальная колькасць людзей, якая часова і пастаянна пражывала ў Полацку ў XVIII ст., была значна большай і магла дасягаць 8 – 10 тыс. чалавек.

Адміністрацыйным цэнтрам горада з’яўлялася ратуша каля рынкавай плошчы. Прыводзяцца даныя пра асартымент крам, знешні выгляд лавак і мастаавых гарадскога рынка, зямельныя ўчасткі і катэгорыі асноўных нерухомых аб’ектаў (“пляц”, “двор”, “дворище”, “оселость”, “маетность”, “святліца”, “упокоец”, “ізба белая”, “клець”, “камора”, “схованье для сена”, “шопа для вазоў”, “стайня”, “свіран”, “пякарня”, “лазня”, “бровар”, “важніца”, “капніца” і інш.).

Аналізуецца сельскагаспадарчая вытворчасць у Полацку.

**5.3.1 Вялікі пасад** у XVI – XVIII стст. з’яўляўся найбуйнейшай адзінкай у сацыятапаграфічнай структуры Полацка. Паводле прывілею Стэфана Баторыя ўсе полацкія праваслаўныя цэрквы і манастыры ў 1582 г. перададзены езуітам. Прыводзяцца даныя аб колькасці і размяшчэнні цэркваў і касцёлаў на тэрыторыі пасада.

Зроблена выснова аб размяшчэнні ратушы на месцы ўзведзенага ў 1780 г. дома генерал-губернатара. Прыведзены даныя аб размяшчэнні і назвах асноўных вуліц Вялікага пасада. У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. згодна з праектам рэгулярнай перапланіроўкі гарадская тапаграфія была значна зменена.

**5.3.2 Запалоцкі пасад.** На Запалоцкім пасадзе ў 1498 г. быў пабудаваны бернардзінскі кляштар (лакалізаваны падчас археалагічных раскопак 2010 г.). У 1563 г. падчас захопу Полацка войскамі Івана IV бернардзінскі кляштар на Запалоцкім пасадзе спыніў сваё існаванне. Прыводзяцца даныя пра цэрквы XVI – XVII стст., а таксама сядзібную забудову і агароды на тэрыторыі Запалоцкага пасада.

**5.3.3 Экіманскі пасад.** У выніку археалагічных даследаванняў быў вызначаны час утварэння культурнага пласта на тэрыторыі былога Экіманскага пасада (другая палова XV – XIX ст.) і тэрыторыя яго залягання (7 га). Культурнага пласта, ранейшага за гэты час, археалагічна не выяўлена.

Назва “Экімань” паходзіць ад назвы храма Іаакіма і Ганны. У рэвізіі 1552 г. Экімань згадваецца як пасяленне з развітай тапаграфічнай структурай, уласна пасад.

Многія людзі як на Экіманскім пасадзе, так і на Крыўцовым займаліся агародніцтвам і выпадалі з сістэмы сацыяльна-эканамічнага развіцця горада. У 1650-я гг. пасад меў разгалінаваную вулічную сетку.

Прыведзены даныя аб існаванні цэркваў у Экімані. Зроблена выснова, што Экіманскі пасад утварыўся ў пачатку XVI ст. за кошт перасяленцаў з Вялікага і Запалоцкага пасадаў Полацка. З канца XVI ст. Экімань з’яўляецца найбуйнейшай юрыдыкай езуітаў, згаданай у люстрацыі 1774 г. як фальварак.

**5.3.4 Крыўцоў пасад.** Крыўцоў пасад фарміраваўся на працягу другой паловы XV – XVII стст. У 1552 г. буйнейшымі тэрытарыяльнымі адзінкамі на левабярэжжы р. Дзвіны з’яўляліся пасады Востраўскі, Слабадскі і Крыўцоў. У XVII ст. на левым беразе Дзвіны існаваў Крыўцоў пасад са слабадскімі мясцовасцямі і Востравам.

Слабая заселенасць Крыўцовага пасада ў сярэдзіне XVI ст. сведчыць пра адсутнасць на ім разгалінаванай інфраструктуры, людзі сяліліся на беразе р. Дзвіны, на ўзвышшы надпоймавай тэрасы. Гісторыя Крыўцовага пасада ў сярэдзіне XVI ст. налічвала крыху больш за 50 гадоў, у той час калі Слабада і Востраў паводле археалагічных даных былі заселены з XI ст.

Культурны пласт на тэрыторыі Крыўцовага пасада размешчаны ўздоўж р. Дзвіны паласой шырынёй каля 150 м. Плошча Крыўцовага пасада разам са Старой Слабадой і Востравам складае 22 га.

Прыводзяцца даныя аб цэрквах і сядзібнай забудове Крыўцовага пасада. Каля Крыўцовага пасада размяшчаўся буйнейшы манастыр св. Барыса і Глеба.

У вызначаны час каля Полацка існавалі сельскагаспадарчыя прадмесці. Асноўныя з іх – гэта “сяльцо” Прасмужкі з ворыўнымі землямі і сенажацямі на ўсход ад Вялікага пасада за валатоўкамі (згадваецца ў XIV – XVIII стст.); манастыр св. Мікалая на Лучне на месцы сучаснай вёскі Ропна на 5 км уніз па р. Дзвіне, каля якога, верагодна, існавала слабада; фальваркі XVII – XVIII стст., якія існавалі на тэрыторыі сучаснага мікрараёна Полацка “Аэрадром”.

**5.4 Абарончыя ўмацаванні полацкіх пасадаў XI – XVIII стст.** Наяўнасць у Полацку XI ст. сістэмы магутных абарончых умацаванняў пацвярджаюць дзве скандынаўскія сагі: “Дзеянні датчан” (мяжа XII – XIII стст.) і “Сага аб Тыдрыку Бернскім” (каля 1250 г.). Полацк – адзіны горад з дванаццаці вядомых скандынавам гарадоў Старажытнай Русі, у якім згадваюцца крапасныя ўмацаванні. Апісаныя ў “Сазе аб Тыдрыку Бернскім” канструкцыі крапасных сценаў маюць прамое дачыненне да вакольнага горада. Абарончыя збудаванні вакольнага горада XI ст. былі вывучаны падчас раскопак 1987 – 1988 і 2002 гг. Звестак пісьмовых крыніц аб наяўнасці абарончых умацаванняў Вялікага і Запалоцкага пасада раней за пачатак XVI ст. няма, аднак археалагічна адкрыта крапасная сцяна Запалоцкага пасада XI ст. Абавязак “Полтеск рубливать”, вызначаны вялікім князем Казімірам у 1460 г., датычыўся Верхняга замка.

Першы гарадскі паркан атачаў вакольны горад у першай палове XI ст. і Запалоцкі пасад у XI – XII стст. Вакольны горад у XI ст. быў умацаваны крапасной сцяной з драўляных гародняў і гародняў, зробленых у перакладной (руставай) тэхніцы. Запалоцкі пасад атачала сцяна з драўлянага вастракола. З таго часу і да пачатку XVI ст. звесткі ў пісьмовых крыніцах аб умацаваннях пасадаў адсутнічаюць. Надзейных археалагічных сведчанняў пра іх існаванне таксама няма. Каля 1501 г. быў узведзены паркан Вялікага і Запалоцкага пасадаў, які неаднаразова перарабляўся ў першай палове XVI ст. і выпальваўся падчас аблог маскоўскім войскам. Паркан першай паловы XVI ст. уяўляў сабой вастракол з бярвенняў, з напольнага боку быў выкапаны роў. Паміж 1552 – 1563 гг. замест вастракола вакол Вялікага пасада пабудаваны зрубныя гародні. Пасля Інфлянцкай вайны новы паркан Вялікага пасада быў адбудаваны толькі ў 1638 г. Паркан уяўляў сабой драўляныя клеці каркаснага тыпу. Аналагічная канструкцыя крапасных сцен адлюстравана археалагічнымі і пісьмовымі крыніцамі 1654 – 1655 гг. У пачатку XVIII ст. захаваўся толькі роў былой крапасной сцяны Вялікага пасада, з таго часу пасадскія ўмацаванні да 1812 г. больш не аднаўляліся.

**5.5 Гарадскія могілкі.** З'яўляюцца важным элементам тапаграфічнай структуры Полацка IX – XVIII стст.

**5.5.1 Могільнік X – XI стст.** *"Паўночны курганны могільнік"* знаходзіўся на правабярэжжы р. Палаты. Могільнік цягнуўся з паўночнага ўсходу ўздоўж правага берага р. Палаты ад Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра на паўднёвы захад і набліжаўся да выгіну старога русла р. Палаты, ад якога пачынаецца прыродны роў, пазначаны на малюнку С. Пахалавіцкага як "Fossa naturalis". Паўднёвая мяжа могільніка магла размяшчацца прыблізна на адлегласці 1 км ад р. Дзвіны. *"Усходні курганны могільнік"* размяшчаўся ўздоўж правага берага р. Дзвіны прыблізна па трасе сучаснай вуліцы Ніжнепакроўскай. Акрамя плана Пахалавіцкага, звесткі аб існаванні *"курганов"* ці *"валатовак"* на месцы "ўсходняга курганнага могільніка" змяшчаюцца ў Лебедзеўскім летапісе, у рэвізіі полацкага павета 1563 г. і магістрацкіх кнігах XVII – XVIII стст. У запісах магістрацкіх кніг назва часткі валатовак "усходняга курганнага могільніка" пазначаецца як "горы Балгарэйскія".

Існаванне "ўсходняга курганнага могільніка" пацвярджаецца і матэрыяльнымі помнікамі. Да нядаўняга часу да іх ліку можна было аднесці толькі меч тыпу V паводле Петэрсана, які датуецца X ст. Сёння атрыманы артэфакты, якія сведчаць аб існаванні пахавальных комплексаў (пахавальная ляпная кераміка). Насыпы "ўсходняга курганнага могільніка" размяшчаліся паласой уздоўж правага берага р. Дзвіны. Яны пачыналіся ў раёне межаў паркана XVI ст. і цягнуліся не менш як на 1500 м на ўсход ад Верхняга замка. На сучаснай карце Полацка гэта адпавядае прасторы паміж вул. Свярдлова, Ніжнепакроўскай, Камуністычнай і Юбілейнай.

**5.5.2 Могілкі XII – XIII стст.** Імклівае пашырэнне хрысціянства ў XII – XIII стст. абумовіла з'яўленне зусім новага тыпу пахавальнага комплексу, звязанага з культавымі будынкам і прылеглай да яго тэрыторыі – царкоўным дваром. Унутры цэркваў хавалі знатных ці заможных нябожчыкаў і вышэйшы царкоўны клір, а простых гараджан – на гарадскіх могілках. Пахаванні XII ст. унутры цэркваў у цагляных саркафагах выяўлены ў прыбудовах да Сафійскага сабора, храме-пахавальні полацкіх епіскапаў у Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры, каля цэркваў на стрэлцы Ніжняга замка і на рове (Ражаства Хрыстова). Баяры маглі быць пахаваны пры царкве Багародзіцы, згаданай пад 1159 г.

**5.5.3 Могілкі XIV – XVIII стст.** Звестак пра могілкі XIV – XV стст. у пісьмовых крыніцах не захавалася. Адзінай крыніцай іх вывучэння з'яўляюцца даныя археалогіі. Найбольш раннімі ў разглядаемы перыяд з'яўляюцца археалагічна выяўленыя пахаванні на Востраве як магчыма сінхронныя часу існавання Іаана-Прадцечанскага манастыра (спыніў дзейнасць у сярэдзіне XVI ст.).

У пачатку XII ст. на стрэлцы Ніжняга замка будуецца царква-пахавальня. П.А. Рапапорт прыводзіць даныя пра наяўнасць пахаванняў у трунах каля зне-

шняга боку падмуркаў царквы, якія, на яго думку, адносіліся да часу функцыянавання царквы (XII – XVI стст.)

Гарадскія могілкі XVI – XVIII стст. зафіксаваны ў асобных частках Полацка (Вялікі, Запалоцкі, Крыўцоў і Экіманскі пасады, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, прылеглыя да Полацка тэрыторыі каля Вялікага і Запалоцкага пасадаў). У гэты час канфесійнае жыццё становіцца стракатым, існуюць пахаванні з каталіцкім і ўніяцкім насельніцтвам, і асобна – праваслаўныя могілкі. Найбольш даследаванымі з'яўляюцца могілкі XVII – XVIII стст. на месцы старога гарадзішча і экіманскія. Паводле антрапалагічнай экспертызы зроблена выснова аб падабенстве полацкай краніалагічнай серыі з гарадзішча і храналагічна блізкай серыі сельскага насельніцтва Беларусі, што ўказвае на мясцовае паходжанне насельніцтва, яго генетычныя сувязі з карэннымі жыхарамі Беларусі. На могілках гарадзішча і ў Экімані зафіксавана заходняя ці паўночна-заходняя арыенціроўка шкілетаў у драўляных трунах з дошак ці выдзяўбаных з цэльнага кавалка дрэва, практычна безынвентарны характар пахавання, целы закопваліся на глыбіню 1 – 1,5 м. Могілкі дзейнічалі на працягу некалькіх стагоддзяў, у межах адной магілы, як правіла, размяшчаліся адзін над адным розначасовыя пахаванні.

У шостай главе **"Рамесныя заняткі і гандлёвыя сувязі палачан"** раскрываецца значэнне Полацка як важнага рамеснага і гандлёвага цэнтра.

**6.1 Рамесныя заняткі.** У IX – X стст. рамяство, верагодна, мела абшчынны характар. З-за недахопу наяўных археалагічных даных больш дакладна вызначыць характар рамяства на пасяленнях Беларускага Падзвіння на сённяшні дзень з'яўляецца невырашальнай задачай. Ювелірнае рамяство з'яўляецца адзіным, сляды якога выразна зафіксаваны ў раннегарадскіх напластаваннях вакольнага горада. Росквіт рамёстваў прыпадае на XI – XIII стст. Гэта шмат у чым абумовіла станаўленне Полацка як горада ў сацыяльна-эканамічным разуменні. Паводле археалагічных даных у Полацку XI – XIII стст. выяўлены сляды наступных рамёстваў: кавальскае, ювелірнае, гарбарнае і кушнерскае, дрэваапрацоўчае, касцярэзнае, камнячоснае і ганчарнае.

Вылучаны комплексы вытворчых майстэрняў (наяўнасць спецыялізаваных рамесных інструментаў, паўфабрыкатаў і гатовых вырабаў, рэшткаў жылых і вытворчых пабудоў, сыравіны, адыходаў вытворчасці). Археалагічна зафіксаваны сляды кавальскіх, зброевых, ювелірных, гарбарных, касцярэзных вытворчых рамесных майстэрняў XI – XVIII стст. Прадстаўлена картаграфія размяшчэння вытворчых комплексаў і іх апісанне. У межах пасадскай тэрыторыі зафіксавана наяўнасць майстэрні XII ст. па вытворчасці плінфы. Прыведзены аргументы аб магчымасці вытворчасці высокамастацкіх ювелірных вырабаў у г. Полацку.

З 1601 г. полацкія рамеснікі аб’ядноўваюцца ў цэхі. Напрыканцы XVIII ст. у Полацку нараджаецца мануфактурная вытворчасць. Паскарэнне тэмпаў мураванага дойлідства ў сярэдзіне XVIII ст. выклікала патрэбу ў вялікай колькасці кваліфікаваных рамеснікаў. У выніку шырокамаштабных будаўнічых работ у Полацку сталі больш запатрабаванымі паслугі гандляроў, пачалі актыўна развівацца шляхі зносін. Адным з найбольш значных вытворчых цэнтраў становіцца езуіцкі калегіум, у якім працавалі і навучаліся рамеснікі шматлікіх спецыяльнасцяў.

**6.2 Гандлёвыя сувязі.** Сведчаннем знешнеэканамічных зносін з’яўляюцца асобныя катэгорыі археалагічных знаходак. Археалагічныя артэфакты сведчаць аб наяўнасці гандлёвых сувязяў па шляху “з варагаў у грэкі” у X – XI стст. Прыведзена апісанне і колькасны склад артэфактаў імпартнага паходжання XI – XIII стст. і асноўныя катэгорыі імпартных рэчаў XIV – XV стст. Упершыню рэгламентацыя гандлёвых адносін занатавана ў хроніцы Генрыха Лацвійскага (1210 – 1212 гг.) і “Смаленскай праўдзе” 1229 г. З XIII ст. Полацк становіцца цэнтрам сталага гандлю немцаў у Падзвінні. Тут існавала пастаянная факторыя Ганзы, якую Рыга пераўтварыла ў свой філіял і кіравала ўсім яе жыццём. Нямецкая факторыя, верагодна, размяшчалася на тэрыторыі Запалоцкага пасада, каля яе ці ўласна на яе тэрыторыі ў 1498 г. быў пабудаваны бернардзінскі кляштар. Археалагічныя калекцыі не адлюстроўваюць асобныя віды тавараў, якія траплялі з іншых земляў (напрыклад, тканіна). Даныя пісьмовых крыніц узбагачаюць уяўленні пра асобныя катэгорыі прадукцыі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Полацк з’яўляецца адным з самых старажытных гарадоў на тэрыторыі Старажытнай Русі. Полацк узнік на старажытным гарадзішчы і паселішчах каля яго. Гэтыя гістарычныя помнікі былі заселены балцкім насельніцтвам днепра-дзвінскай і банцараўска-тушамлінскай культур. У апошняй чвэрці I тыс. на гарадзішчы і паселішчах каля яго рассяляюцца носьбіты культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Культурны пласт трэцяй і апошняй чвэрці I тыс. н. ч. найлепш захаваўся на тэрыторыі паселішча на тэрыторыі будучага Ніжняга замка. Керамічны комплекс банцараўска-тушамлінскай культуры і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў з гэтага пласта сведчыць аб пэўным этапе сумеснага пражывання двух этнасаў (усходніх балтаў і славян-крывічоў) пачатковага Полацка. Што тычыцца гарадзішча, то керамічныя комплексы адзначанага часу тут прысутнічаюць у моцна перамешаных культурных напластаваннях разам з раннеганчарнай керамікай, што сведчыць пра больш складаны характар гісторыі помніка.

Археалагічны матэрыял пацвярджае паведамленні летапісных крыніц аб існаванні Полацка ў IX – X стст. разам з такімі “градамі”, як Ладага, Ноўгарад (Рурыкава гарадзішча), Ізборск, Пскоў. Сацыятапаграфічная структура Полацка ў IX – XIII стст. прайшла складаны шлях развіцця, які мае свае адрозненні ад аналагічных працэсаў у многіх гарадах Старажытнай Русі. Скандынаўскіх па паходжанні рэчаў у Полацку знойдзена значна менш у параўнанні з Ладагай і Ноўгарадам. Стратыграфія культурнага пласта Полацка і матэрыяльная культура другой паловы I тыс. мае найбольшыя падабенствы з гарадамі Беларускага Падзвіння (Віцебскам і Лукомлем). І хаця пісьмовыя крыніцы згадваюць гэтыя гарады ў больш позні час, няма сумненняў у іх “протагарадскім” этапе ў IX – X стст.

Асноўным фактарам, які вылучае Полацк з ліку сінхронных пасяленняў Беларускага Падзвіння, з’яўляецца яго вядучая палітычная, а як вынік – і сацыяльна-эканамічная роля. “Стартавыя” магчымасці для развіцця пасялення Полацк атрымаў дзякуючы размяшчэнню на ім княжацкай адміністрацыі. Гэтая адміністрацыя спачатку васальна падпарадкоўвалася Рурыку, а пасля пераносу сталіцы Русі ў Кіеў (882 г.) была падначалена князю Алегу. У другой палове X – XI стст. полацкія князі разглядалі Ноўгарад як канкурэнта ў знешне-эканамічным гандлі па шляху “з варагаў у грэкі”. Пра гэта сведчаць паход наўгародскага князя Уладзіміра Святаславіча на Полацк і забойства полацкага князя Рагвалода (каля 890 г.), паходы полацкіх князёў Брачыслава Ізяславіча (1021 г.) і Усяслава Брачыславіча (1066 г.) на Ноўгарад. Адсутнасць на полацкім гарадзішчы слядоў размяшчэння варажскай дружыны ў IX – X стст. сведчыць аб дамінаванні мясцовых баярскіх родаў, падпарадкаваных спачатку інтарэсам Ноўгарада і Кіева, а ў далейшым, з часоў Рагвалода і Брачыслава Ізяславіча, падтрымліваючых мясцовага князя [2 – 4; 8; 10; 14; 17; 22; 24 – 26; 29 – 33; 35 – 37; 39 – 41; 43].

2. Дзядзінец Полацка ў IX – XIII стст. існаваў на старажытным полацкім гарадзішчы, а з пачатку XIV ст. яго функцыі стаў выконваць Верхні замак. У XI – XVI стст. Верхні замак – старажытны сакральны цэнтр, які выкарыстоўваўся і для адміністрацыйна-цырыманіяльных мэтаў. Акрамя таго, Верхні замак мог з’яўляцца месцам дзейнасці князя (XI – XIV стст.) і яго пражывання (пасля 1326 г.). На Верхнім замку жылі княжацкі намеснік (з 1392 г.), ваявода (з 1504 г.), уладыка, баяры і мяшчане, тут жа размяшчаўся шэраг манастыроў і быў пабудаваны Сафійскі сабор. Выкарыстанне тэрміна *“дзяцінец”* у дачыненні да Верхняга замка правамоцна толькі з пачатку XIV ст. [2 – 4; 17; 19; 22; 24; 26; 27; 32; 36; 39].

3. Планіровачная структура полацкіх пасадаў складалася ў межах пяці этапаў:

I этап – станаўленне вакольнага горада (“малога” пасада) першай паловы XI ст. на месцы старажытнага паселішча (канец VIII – X стст.), развіццё пасяленняў за р. Палатой (з X ст.), фарміраванне сацыятапаграфічнай структу-

ры Вялікага і Запалоцкага пасадаў на працягу XI ст., існаванне пасялення на месцы Старой Слабады пры вусці р. Бельчыцы (з X ст.) і Вострава на р. Дзвіне (XI ст.). Першыя сведчанні пра пабудову паркана Запалоцкага пасада (XI ст.).

II этап – XII – XV стст. Спыненне існавання вакольнага горада, скарачэнне плошчы Запалоцкага пасада (пачатак XIII ст.), спыненне існавання пасяленняў за р. Палатой, уключэнне старога гарадзішча ў склад Вялікага пасада і павелічэнне тэрыторыі Верхняга замка за кошт часткі Вялікага пасада (пачатак XIV ст.).

III этап – першая палова XVI ст. (да 1563 г.). Утварэнне левабярэжных пасадаў Полацка (Востраўскі, Крыўцоў, Слабадскі і Экіманскі) за кошт перасяленцаў з Вялікага і Запалоцкага пасадаў (пачатак XVI ст.). Скарачэнне тэрыторыі Запалоцкага пасада (першая палова XVI ст.). Будаўніцтва паркана Вялікага і Запалоцкага пасадаў (каля 1501 г.).

IV этап – 1563 – 1579 гг. Пабудова на частцы Вялікага пасада Ніжняга замка, змена русла р. Палаты (1563 г.). Спыненне існавання Вялікага пасада. Аднаўленне тэрыторыі Запалоцкага пасада ў межах паркана.

V этап – 1579 г. – канец XVIII ст. Перанос гарадской рынкавай плошчы (1581 г.). Пераўтварэнне старога гарадзішча ў гарадскія могілкі (XVII ст.). Арганізацыйнае аб’яднанне левабярэжнага насельніцтва Полацка ў межах Крыўцовага і Экіманскага пасадаў.

Запалоцкі пасад быў умацаваны драўляным вастраколам у XI – XII стст., абарончая сцяна вакольнага горада складалася з гародняў і на асобных участках была зроблена ў перакладной (руставай) тэхніцы з выкарыстаннем камянёў у падмурку. Даныя пра абарончыя ўмацаванні Вялікага пасада ў гэты час адсутнічаюць [1 – 3; 6 – 8; 11; 12; 14 – 16; 18; 20 – 22; 24; 27; 28; 30; 31; 39; 41; 42; 44 – 46].

4. Тэрыторыя левабярэжных Крыўцовага і Экіманскага пасадаў была заселена ў пачатку XVI ст. залежным ад баяр і духавенства насельніцтвам Вялікага і Запалоцкага пасадаў. Засяленне левабярэжнай часткі Полацка было звязана з частымі войнамі першай паловы XVI ст. (паходы 1508, 1513, 1518 гг.), у выніку якіх правабярэжныя пасады разам з парканам выпальваліся, а насельніцтва было вымушана разысціся.

Каля 1501 г. у Полацку быў пабудаваны “паркан” – умацаванні Вялікага і Запалоцкага пасадаў, плошча якіх у той час была адпаведна каля 60 і 17 га. Паркан Вялікага пасада неаднаразова перабудоўваўся і праіснаваў як фартыфікацыйная адзінка да пачатку XVIII ст. Запалоцкі паркан праіснаваў з рознымі перабудовамі да вайны 1654 – 1667 гг.

Пасяленні палачан размяшчаліся і па-за межамі крапасной сцяны і былі даследаваны археалагічна. Забудова XI – XVIII стст. адкрыта на “вянцы” правага берага р. Палаты насупраць Верхняга і Ніжняга замкаў, полацкага гарадзішча [1 – 5; 23; 27; 30; 31; 38; 42].

5. Паводле археалагічных даных, у XVI – XVII стст. у Полацку існавала разгалінаваная сістэма вулічнай планіроўкі, асноўныя рысы якой можна прасачыць з XII ст. Назвы асноўных вуліц полацкіх пасадаў з’яўляюцца вельмі ўстойлівымі на працягу XVII – XVIII стст. (рэтраспектыўна па назвах асобных вуліц тое ж адзначаецца і для XVI ст.). Значная перапланіроўка вулічнай сеткі адбылася не раней за пачатак XIX ст., што адпавядала патрэбам масавага мураванага грамадзянскага будаўніцтва і новым гістарычным рэаліям развіцця Полацка.

Вялікі і Запалоцкі пасады Полацка ў XVI – XVIII стст. былі падзелены вуліцамі, якія размяшчаліся адна ад другой прыкладна на аднолькавай адлегласці. Прастора паміж вуліцамі была роўная двум гарадскім пляцам. Археалагічна вызначана, што адзін гарадскі пляц ва ўсходняй частцы Верхняга замка ў XVI – XVIII стст. быў роўны 100 – 160 м$^2$. Такая ж плошча пляцаў тут існавала з XII ст., калі гэтая тэрыторыя яшчэ была пасадскай. У XVI ст. плошча некаторых пляцаў на вул. Вялікай магла дасягаць 300 м$^2$. На пасадскай тэрыторыі Полацка ў 1553 г. існавалі і невялікія пляцы, роўныя 58,44 м$^2$.

Вуліцы маглі размяшчацца на адлегласці каля 20 – 50 м адна ад адной. Гэтая больш шчыльная ў параўнанні з сучаснай трасіроўка вуліц гістарычнага цэнтра Полацка адпавядала патрэбам гарадской забудовы, якая ў асноўным была аднапавярховай і драўлянай. Тапаграфічныя апісанні аб’ектаў нерухомасці сведчаць, што большасць пляцаў размяшчаліся радамі ўздоўж вуліц ці на “венцах” рэк Дзвіна, Палата, Бельчыца. Як правіла, тыльным бокам пляцы межавалі з суседнім радам забудовы другой вуліцы.

Назвы некаторых вуліц XVII – XVIII стст. адлюстроўваюць статус сядзіб ці прыналежнасць іх насельніцтва (мясцовасць Баяршчызна і вул. Баярская ў Экімані, вуліца Вялікая на Вялікім, Запалоцкім і Крыўцовым пасадах). Асобныя вуліцы ў назве вызначаюць функцыянальную прыналежнасць, накірункі шляхоў ці тапаграфічныя асаблівасці мясцовасцяў (вул. Выгонная, Прабойная, Вазнічая, мясцовасць Плігаўкі на Вялікім пасадзе, Віленская на Экіманскім пасадзе і інш.). На асобных вуліцах былі размешчаны аднайменныя цэрквы (Вазнясенская, Іллінская, Пятніцкая на Вялікім пасадзе).

У XIV – XVIII стст. вакол Полацка існавалі сельскагаспадарчыя прадмесці. Асноўныя з іх – гэта сяло Прасмужкі, манастыр св. Мікалая на Лучне са слабодкай, фальваркі XVII – XVIII стст. за р. Палатой. Паміж Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыром і Прасмужкамі ў раёне Валовага возера існавала Невельскае прадмесце [1 – 3; 30; 31; 42].

6. Генезіс сацыяльнай тапаграфіі Полацка мае найбольшыя падабенствы з гарадамі Беларускага Падзвіння IX – XIII стст. Віцебскам і Лукомлем. У гарадах Старажытнай Русі дамінавала канчанская сацыяльная і тэрытары-

яльная арганізацыя насельніцтва. Канчанская сацыяльная і тэрытарыяльная структура ў Полацку і іншых старажытных гарадах Беларускага Падзвіння не склалася. Найбольш даследавана канчанская сацыяльная і тэрытарыяльная структура Ноўгарада. Сацыяльная структура канцоў характарызуецца дуалізмам: наяўнасцю залежнага ад баярскага пасадніцтва гандлёва-рамеснага насельніцтва, т. зв. “сотняў”, якія падпарадкоўваліся вечу, а таксама княжацкім соцкім і тысяцкаму. Баярскае землеўладанне ў гарадскіх канцах безумоўна дамінавала. На полацкіх пасадах пераважала землеўладанне гарадскіх абшчыннікаў – рамеснікаў і гандляроў. У Полацку мяшчанская абшчына была вылучана са складу зямлі-воласці толькі пасля надання магдэбургскага права (1498 г.). Найбольш вострa праблема ўзаемаадносін насельніцтва гарадскіх юрыдык і магістрата паўстала ў XVI – першай чвэрці XVII ст. Юрыдычная прыналежнасць мяшчан Крыўцовага пасада да полацкага магістрата была замацавана толькі ў 1622 – 1623 гг. Экіманскі пасад заставаўся юрыдыкай полацкіх езуітаў з 1580 г. і на працягу ўсяго разглядаемага перыяду [2; 22; 24; 26; 31; 32; 42].

7. Колькасць насельніцтва Полацка ў IX – XVIII стст. істотна вагалася. Традыцыйная ў археалогіі методыка падліку колькасці насельніцтва ў залежнасці ад плошчы пасялення і шчыльнасці забудовы не заўсёды карэлюецца з данымі пісьмовых крыніц. Максімальная колькасць насельніцтва Полацка – каля 10 тыс. чалавек – пражывала ў XI – XVII стст., пры гэтым значныя скарачэнні адбываліся ў пачатку XVI ст. і падчас Інфлянцкай вайны 1563 – 1579 гг. Пасля вайны 1654 – 1667 гг. і ў XVIII ст. у горадзе на ўласных “пляцах” пражывала ад 0,4 тыс. чалавек у 1667 г. да 4 тыс. чалавек напрыканцы XVII ст. і ў XVIII ст. У XVIII ст. у горадзе на будаўніцтве шматлікіх мураваных аб’ектаў была задзейнічана вялікая колькасць людзей. Акрамя гэтага, гандляры і сяляне з полацкай акругі пастаянна наведвалі горад на розны тэрмін. Такім чынам, рэальная колькасць людзей, якая часова і пастаянна пражывала ў Полацку ў XVIII ст., магла дасягаць 8 – 10 тыс. чалавек. У XVI – XVIII стст. асноўнай крыніцай папаўнення гарадскога насельніцтва з’яўлялася полацкая акруга [1 – 3; 22; 29 – 31; 42].

8. Развіццё пасадаў не магло адбывацца без разгалінаванай рамеснай вытворчасці. У Полацку з X ст. існавала мясцовая вытворчасць ювелірных рэчаў, з XII ст. – шкляных вырабаў. У XI – XIII стст. у Полацку развіваліся наступныя віды рамёстваў: кавальскае, ювелірнае, гарбарнае і кушнерскае, дрэваапрацоўчае, касцярэзнае, каменячоснае і ганчарнае. У XII ст. адкрыты сляды зброевай майстэрні. У XIV – XVI стст. зафіксаваны рэшткі дзвюх касцярэзных майстэрняў.

Рамесная вытворчасць XVI – XVIII стст. была вельмі разнастайнай па асартыменце і відах прадукцыі. У XVI ст. адбываецца аб’яднанне рамеснікаў у буйныя карпарацыі (брацтвы), аснову будучых цэхаў. З XVII ст. полацкія

рамеснікі аб’ядноўваліся ў цэхавыя арганізацыі (кавалёў, краўцоў, шапачнікаў, гарбароў, цырульнікаў, ганчароў, печнікаў, муляроў, цагельнікаў, злотнікаў).

Гандлёвыя сувязі насельніцтва Полацка былі непарыўна звязаны з запатрабаваннямі рамеснай вытворчасці. Так, развіццё ювелірнай справы цалкам залежала ад прывазной сыравіны, увоз якой займаў істотнае месца ўжо ў X – XI стст. Археалагічныя даныя сведчаць пра існаванне шматлікіх рэгіёнаў, з якімі былі ўсталяваны прамыя ці апасродкаваныя гандлёвыя кантакты. Асноўныя з іх – гэта тэрыторыя сучаснай Германіі, Польшчы, Прыбалтыкі, Скандынавіі. Сувязі з гэтымі рэгіёнамі існавалі ўжо ў X ст. і працягвалі развівацца ў XI – XVIII стст. У XI – XIII стст. у Полацк трапляюць шматлікія рэчы з Візантыі, грэчаскіх правінцый і ўсходнерускіх княстваў, у XV – XVI стст. існуюць сведчанні пра гандлёвыя кантакты з Турцыяй і краінамі Усходу. У XVI – XVIII стст. пачынаецца актыўнае ўзаемапранікненне тавараў з Полацка ў Маскоўскую дзяржаву [1 – 3; 9; 11 – 13; 20; 21; 34; 37; 41; 45; 46].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Палажэнні дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны як пры напісанні навуковых кніжных выданняў, вучэбных і спецыяльных работ па археалогіі і гісторыі Беларусі, так і пры распрацоўцы адпаведных лекцыйных курсаў па гістарычных дысцыплінах, якія выкладаюцца ў агульнаадукацыйных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых установах адукацыі.

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца пры стварэнні вучэбнага выдання “Полацказнаўства” для сярэдніх агульнаадукацыйных школ г. Полацка. Вынікі даследавання адлюстраваны ў выкладаемых аўтарам дысцыплінах: “Археалогія Беларусі”, “Гісторыя Беларусі”, “Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі”, у спецкурсе “Гісторыя Полацка (па матэрыялах археалагічных даследаванняў)” для студэнтаў спецыяльнасці “Гісторыя” гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ. Вынікі даследавання выкарыстаны пры напісанні вучэбна-метадычных комплексаў “Гісторыя Полацка (па матэрыялах археалагічных даследаванняў)” [3] і “Археалогія” [4].

Назапашаныя ў выніку археалагічных раскопак артэфакты перададзены ў фонды НПГКМЗ і ІГНАНБ. Вынікі дысертацыйнага даследавання шырока запатрабаваны пры стварэнні тэматычных экспазіцый НПГКМЗ і ІГНАНБ, састаўленні музейных каталогаў і арганізацыі выстаў.

Вопыт гістарычнага даследавання на падставе даных, у першую чаргу археалагічных крыніц, сведчыць пра мэтазгоднасць далейшага археалагічнага вывучэння Полацка. У плане арганізацыі археалагічных раскопак мэтазгодна працягнуць і пашырыць працу комплекснай археалагічнай экспедыцыі па вы-

вучэнні Полацка і Полацкай зямлі пасля 2012 г. Для гэтага ёсць вопыт дзейнасці экспедыцыі, навуковыя вынікі і пастаноўка новых актуальных задач. У прыватнасці, разам з прадаўжэннем археалагічнага даследавання Полацка неабходна скіраваць дзейнасць на вывучэнне працэсаў станаўлення горада як рэгіянальнага цэнтра.

Пераўтварэнне Полацка ў значны культурны і турыстычны цэнтр Беларусі, актыўна распачатае на дзяржаўным узроўні, немагчыма без навуковага асэнсавання багатай гістарычнай спадчыны. Стварэнне турыстычнай інфраструктуры патрабуе рэканструкцыі фрагментаў старажытнай забудовы, старадаўніх рамёстваў і экспазіцыі аўтэнтычных сярэдневяковых гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Дысертацыйнае даследаванне прадстаўляе навуковую аснову для стварэння экскурсійных праграм, гістарычных маршрутаў і рэканструкцый.

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў справе аховы гісторыка-культурных помнікаў Полацка і пошуку аптымальных мадэляў іх далейшага вывучэння. У 2010 г. на дзяржаўны улік і ахову была прынята даследаваная аўтарам частка Запалоцкага пасада (21 га) з прысваеннем ёй статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “2”, што стварае аснову для далейшага вывучэння гэтага ўнікальнага помніка археалогіі.

Дысертацыйнае даследаванне прадстаўляе навуковую базу для рацыянальнага і ашчаднага выкарыстання гістарычнага ландшафту Полацка на сучасным этапе, што з’яўляецца неабходнай умовай для паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця горада пад патранажам органаў дзяржаўнага кіравання.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

## Манаграфіі

1. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў : нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с. : іл.

2. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX – XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с., [22] арк. іл.

## Вучэбна-метадычныя выданні

3. Дук, Д.У. Гісторыя Полацка : па матэрыялах археалагічных даследаванняў : вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01-01 01 “Гісторыя Беларусі”, 1-02 01 02-04 “Гісторыя. Англійская мова” / Д.У. Дук. – Наваполацк : УА “ПДУ”, 2006. – 112 с.

4. Дук, Д.У. Археалогія : вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01 “Гісторыя” / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 156 с.

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах і зборніках

5. Дук, Д. Да вынікаў археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі на тэрыторыі былога Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку ў 2003 г. / Д. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2004. – № 19. – С. 304.

6. Дук, Д. Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI – XVIII вв. (по итогам археологического надзора на территории Великого посада в 2000 – 2002 гг.) / Д.В. Дук, А.А. Соловьёв // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2004. – № 19. – С. 241 – 250.

7. Дук, Д. Археалагічныя раскопкі на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка / Д. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2005. – № 20. – С. 245 – 247.

8. Дук, Д. Да пытання тапаграфічнага развіцця Вялікага пасада Полацка ў XI ст. / Д. Дук, С. Тарасаў // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2005. – № 20. – С. 163 – 168.

9. Дук, Д. Унікальная знаходка з Полацка – керамічная чарнільніца з выявай князёў Барыса і Глеба / Д. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2005. – № 20. – С. 186 – 189.

10. Дук, Д. Аб полацкім некропалі X – XIII стст. / Д. Дук, М. Плавінскі // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2006. – № 22. – С. 173 – 186.

11. Дук, Д. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. / Д. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2006. – № 11. – С. 104 – 113.

12. Дук, Д. Археалагічныя раскопкі і нагляд за будаўнічымі работамі ў Полацку ў 2005 г. / Д. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2006. – № 21. – С. 211.

13. Дук, Д. Большой пожар за две копейки / Д. Дук // Родина. – 2006. – № 4. – С. 14 – 15.

14. Дук, Д. Камни из саги о Тидрике Бернском / Д. Дук // Родина. – 2006. – № 10. – С. 44 – 46.

15. Дук, Д. Лакалізацыя асобных тапаграфічных аб’ектаў Полацка XVI – XVII стст. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 6. – С. 44 – 46.

16. Дук, Д. Археалагічныя раскопкі ў горадзе Полацку і Полацкім раёне ў 2006 г. / Д. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2007. – № 23. – С. 229 – 230.

17. Дук, Д. Древо жизни Полоцкого городища / Д. Дук // Родина. – 2007. – № 10. – С. 37 – 39.

18. Дук, Д. Палата, Запалоцце, Полацк – пачатак сярэдневяковага горада / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 3. – С. 33 – 36.

19. Дук, Д. Святая София о седми версех / Д. Дук // Родина. – 2007. – № 6. – С. 63 – 67.

20. Дук, Д.У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д.У. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2007. – № 1. – С. 2 – 15.

21. Дук, Д.У. Новыя знаходкі рэнесанснай кафлі ў Полацку (да пытання аб сацыятапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада ў першай палове XVI ст.) / Д.У. Дук, А.А. Салаўёў // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси (к 60-летию О.Н. Левко) : материалы по археологии Беларуси. – 2007. – № 14. – С. 215 – 221.

22. Дук, Д.У. Станаўленне Полацка ў IX – XIII стст. / Д.У. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25 – 31.

23. Дук, Д. Величие и безвестие: храмы Бельчицкого Борисоглебского монастыря в Полоцке / Д. Дук // Родина. – 2008. – № 8. – С. 43 – 45.

24. Дук, Д. Полацк у сістэме станаўлення і развіцця сацыятапаграфічнай структуры старажытнарускіх litарадоў IX – XIII стст. / Д.У. Дук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2008. – № 24. – С. 27 – 34.

25. Дук, Д. Старажытныя славяне полацкага гарадзішча (780 – 1310 гг.) / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 7. – С. 21 – 27.

26. Дук, Д.В. От вассалитета до равноправия : Социальные элиты Новгорода и Полоцка в IX – XIII вв. / Д.В. Дук // Родина. – 2009. – № 9. – С. 23 – 26.

27. Дук, Д.У. Абарончыя ўмацаванні полацкіх пасадаў XI – XVIII стст. / Д.У. Дук // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2009. – № 2 – 3(33). – С. 21 – 26.

28. Дук, Д.У. Археалагічны нагляд за правядзеннем будаўнічых работ у г. Полацку ў 2007 г. / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2009. – № 17. – С. 219 – 220.

29. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2009. – № 17. – С. 186 – 189.

30. Дук, Д.У. Гісторыя археалагічнага вывучэння полацкіх пасадаў / Д.У. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2009. – № 2. – С. 2 – 12.

31. Дук, Д.У. Полацкі пасад IX – XVII стагоддзяў : гісторыка-параўнаўчая характарыстыка / Д.У. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2009. – № 1. – С. 2 – 8.

32. Дук, Д. Ад Рагвалода да Івана Грознага : Верхні Замак у сацыяльнай тапаграфіі Полацка / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 5. – С. 8 – 12.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

33. Duk, D. Ethnic Processes on the Territory of the Belarussian Dvina Region in the Condition of Transaction from Heatheism to Christianity / D. Duk, P. Miszyn // Księnga – Nauka – Wiara w średniowiecznej Europie. – Poznań : Wyd. PTPN, 2004. – S. 144 – 150.

34. Дук, Д.У. Шляхі пранікнення і распаўсюджвання культурна-стылістычных накірункаў у матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка ад пачатку XVI да канца XVII ст. / Д.У. Дук // Сімяон Полацкі : светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць : матэрыялы II міжнар. навук. канф. 18 – 19 лістап. 2004 г. – Полацк : НПГКМЗ, 2005. – С. 45 – 57.

35. Дук, Д. Роль и место этнических миграций в формировании славянской (кривичской) культуры на Подвинье / Д. Дук // Rytų Europos Kultūra migracijos kontekste. Tarpdalykiniai tyrimai. (Культура Восточной Европы в контексте миграции. Междисциплинарные исследования). – Lietuvos istorijos institutes : “Versus aureus”, 2007. – С. 473 – 490.

36. Дук, Д.У. Полацкае гарадзішча : міфы і рэаліі (па выніках археалагічных раскопак 2007 г.) / Д.У. Дук // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : тэз. V міжнар. канф. ; уклад. Г.М. Раманенкава. – Полацк : НПГКМЗ, 2007. – С. 21 – 23.

37. Duk, D. Шляхі пранікнення і распаўсюджвання культурна-стылістычных накірункаў у матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка ад пачатку XVI да XVII ст. / D. Duk // Podróżnicy. Fundatorzy. Święci. – Poznań : Wyd. PTPN, 2008. – S. 89 – 95.

38. Дук, Д.В. К итогам археологического надзора за строительными работами на территории Бельчицкого Борисоглебского монастыря в городе Полоцке в 2003 году / Д.В. Дук // Труды Государственного Эрмитажа : [Т.] 46 : Архитектура и археология Древней Руси : материалы науч. конф., посв. 100-летию со дня рождения М.К. Каргера (1903 – 1976) ; Государственный Эрмитаж. – СПб. : Изд-во Гос. Эрмитажа, 2009. – С. 60 – 64.

39. Дук, Д.У. А.М. Ляўданскі – пачынальнік полацкай археалогіі / Д.У. Дук // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап. 2008 г. ; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 3 – 4.

40. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д.У. Дук // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V міжнар. навук. канф., Полацк, 24 – 25 кастрыч. 2007 г. – Полацк : НПГКМЗ, 2009. – С. 255 – 278.

41. Дук, Д.У. Ляпная кераміка і рэчавы комплекс вакольнага горада старажытнага Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) / Д.У. Дук // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап. 2008 г. ; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 9 – 30.

42. Дук, Д.У. Крыўцоў пасад у сацыятапаграфічнай структуры Полацка XI – XVIII стст. // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысв. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А.Р. Брадоўскага, 22 – 23 кастрыч. 2009 г., Віцебск ; рэдкал. : Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 34 – 39.

**Артыкулы ў зборніках**

43. Дук, Д. Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX – XI стст.) / Д. Дук // Спадчына. – 2003. – № 6. – С. 40 – 46.

44. Дук, Д.У. Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 г. / Д.У. Дук // Археалагічны зборнік. Вып. 1 ; Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі ; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск : Юніпак, 2006. – С. 52 – 57.

45. Дук, Д. Полацкая касцярэзная майстэрня XV – першай паловы XVI ст. / Д. Дук // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. II (Вып. 2) ; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2007. – С. 86 – 101.

46. Дук, Д. Рэчавы комплекс з раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 і 2006 гадах / Д. Дук // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. V (Вып. 5) ; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – С. 19 – 45.

# РЭЗЮМЭ

Дук Дзяніс Уладзіміравіч

Полацк IX – XVIII стст.: узнікненне, фарміраванне і развіццё
(па археалагічных і пісьмовых крыніцах)

**Ключавыя словы:** Полацк, горад, пасадская структура, дзяцінец, замак, археалагічныя артэфакты, гарадская інфраструктура, мяшчане, сацыяльная стратыфікацыя, рамяство, гандаль.

**Мэта даследавання** – вывучэнне гісторыі ўзнікнення, дынамікі фарміравання і развіцця гістарычных помнікаў Полацка, сацыяльнай тапаграфіі, гарадскіх рамёстваў і гандлю ў шырокім храналагічным кантэксце (IX – XVIII стст.).

**Метады даследавання.** Падчас працы над дысертацыяй былі выкарыстаны апісальны, гісторыка-параўнальны (кампаратыўны), картаграфічны, праблемна-храналагічны, статыстычны, рэтраспектыўны метады даследавання, а таксама метады археалагічнага датавання – тыпалагічны, стратыграфічны, гісторыка-культурны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыі вырашана праблема ўзнікнення, фарміравання і развіцця Полацка ў IX – XVIII стст. ва ўзаемадзеянні ўсіх кампанентаў усходнеславянскага горада (дзяцінец, замак, вакольны горад, пасады). Упершыню ў гістарыяграфіі абагульнена сукупнасць археалагічных і пісьмовых крыніц і прадстаўлена панарама гістарычнага развіцця Полацка ў эпоху Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Вывады і абагульненні, зробленыя аўтарам дысертацыі, могуць паслужыць падставай для правядзення далейшага навуковага вывучэння шэрага актуальных праблем гісторыі Беларусі, падрыхтоўкі курсавых, дыпломных і магістарскіх работ, а таксама пры напісанні кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Матэрыялы дысертацыі і апублікаваныя вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні манаграфій, абагульняючых работ па гісторыі Беларусі, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, навукова-папулярных работ.

Дысертацыйныя матэрыялы знойдуць прымяненне пры выкладанні дысцыплін археалогіі Беларусі, гісторыі Беларусі, а таксама пры распрацоўцы курса лекцый і спецыяльных курсаў па праблеме вывучэння гісторыі, сацыяльнай тапаграфіі і матэрыяльнай культуры гарадоў Беларусі.

Дысертацыйныя матэрыялы з’яўляюцца асновай для распрацоўкі дзяржаўных праграм па ахове і памнажэнні гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. На іх аснове магчыма стварэнне тэматычных музейных экспазіцый па гісторыі Полацка і яго матэрыяльнай культуры.

# РЕЗЮМЕ

Дук Денис Владимирович

Полоцк IX – XVIII вв.: возникновение, формирование и развитие
(по археологическим и письменным источникам)

**Ключевые слова:** Полоцк, город, посадская структура, детинец, замок, археологические артефакты, городская инфраструктура, мещане, социальная стратификация, ремесло, торговля.

**Цель исследования** – изучение истории возникновения, динамики формирования и развития исторических памятников Полоцка, социальной топографии, городских ремёсел и торговли в широком хронологическом контексте (IX – XVIII вв.).

**Методы исследования.** В работе использованы описательный, историко-сравнительный, картографический, проблемно-хронологический, статистический, ретроспективный методы, а также методы археологического исследования – типологический, стратиграфический, историко-культурный.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертации решена проблема возникновения, формирования и развития Полоцка в IX – XVIII вв. во взаимодействии всех компонентов восточнославянского города (детинец, замок, окольный город, посады). Впервые в историографии обобщена совокупность археологических и письменных источников и представлена панорама исторического развития посадской структуры Полоцка в эпоху Средневековья и Раннего Нового времени.

**Рекомендации по применению.** Выводы и обобщения, сделанные автором диссертации, могут послужить основой для проведения дальнейшего научного изучения ряда актуальных проблем истории Беларуси, при подготовке курсовых, дипломных и магистерских работ, а также при написании кандидатских и докторских диссертаций.

Материалы диссертации и опубликованные результаты диссертационного исследования могут быть использованы при написании монографий, обобщающих работ по истории Беларуси, учебников и учебных пособий, научно-популярных работ.

Результаты исследования найдут применение при преподавании дисциплин археологии Беларуси, истории Беларуси, а также при разработке курса лекций и специальных курсов по проблеме изучения истории, социальной топографии и материальной культуры городов Беларуси.

Диссертационные материалы являются основой для разработки государственных программ по охране и приумножению историко-культурного наследия Полоцка. На их основе возможно создание тематических музейных экспозиций по истории Полоцка и его материальной культуры.

## RESUME

Duk Dzianis Uladzimiravich

Polotsk in the XI – XVIII centuries: genesis, shaping and development
(based on archeological and written sources)

**Key words:** Polotsk, city, posad structure, detinets, castle, archaeological artifacts, urban infrastructure, town dwellers, social stratification, craft, trade.

**The purpose of research –** the purpose of research is to study hon historical monuments appeared in Polotsk, and the dynamics of their shaping and development, and also to study social topography, urban handicraft and trade in a wide chronological context (IX – XVIII centuries).

**Research methods.** In this research the descriptive, historical-comparative, cartographic, problematic-chronological, statistic and retrospective methods have been used, and also suck metods of research as typological, stratygraphic, historical-cultural.

**Outcomes of the research and its novelty.** This dissertation solves the problem of the genesis, shaping and development of Polotsk in the IX – XVIII cc in the interconnection of all the components of an East-Slavonic town (the detinets, the castle, the surrounding settlement, the posad). For the first time in the study of history the total combination of archaeological and written sources data is summarized and the panorama of the historical development of the posad structure of Polotsk in the Middle Ages and Early New Times is presented.

**Recommendations on the application.** The conclusion and generalizations made by the author of this dissertation can serve as a basis for further research into a number of actual problems of the history of Belarus, and also for course papers, diploma works, research for Master's, Candidate's and Doctorate degrees.

The material of the dissertation and the published results of the given research can be used in monographies, summarizing works on the history of Belarus, reference books, text books and popular-science books.

The results of the research will be usetul in teaching the archaeology of Belarus, the history of Belarus, and also while compiling lectures and specialized courses on the problem of the study of history, social topography and material culture of Belarusian towns.

The dissertation material provides the basis for creating state programmes on the preservation and enhancement of the historical and cultural heritage of Polotsk. It can serve as the foundation of museum exhibitions on the history of Polotsk and its material culture.

ДУК Дзяніс Уладзіміравіч

ПОЛАЦК IX – XVIII СТСТ.:
УЗНІКНЕННЕ, ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ
(ПА АРХЕАЛАГІЧНЫХ І ПІСЬМОВЫХ КРЫНІЦАХ)

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

Падпісана да друку 20.10.2011. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,32. Ул.-выд. арк. 2,05.
Тыраж 60 экз. Заказ 1802.

Выдавец і паліграфічнае выкананне :
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

Ліцэнзія ЛВ № 02330/0548568 от 26.06.2009
Ліцэнзія ЛП № 02330/0494256 от 27.05.2009

211440, г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29